

За грошы трэба... плаціць СТАР. 4



Спявак Тэа — у «чамаданным» настроі СТАР. 13

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 КРАСАВІКА 2014 г. СУБОТА № 78 (27688) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ТЭРЫТОРЫЯ ЖЫЦЦЯ

**Паўднёва-ўсходнія раёны Магілёўскай вобласці, пацярпелыя ад аварыі на ЧАЭС, неабходна падцягнуць да ўзроўню самых перадавых у краіне па ўсіх кірунках.**



Фота БЕЛТА.



**Штогод Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведвае рэгіёны краіны, пацярпелыя ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Кіраўнік дзяржавы здзейсніў больш за 40 такіх візітаў, пабываў у дзясятках раёнаў, гарадоў, пасёлкаў і вёсак. Прычым у раёнах, якія апынуліся ў найбольш складанай сітуацыі (Нараўлянскім, Хойніцкім, Жыткавіцкім, Петрыкаўскім, Столінскім, Быхаўскім), — ад 4 да 6 разоў.**

У гэтым годзе кіраўнік дзяржавы адправіўся ў Магілёўскую вобласць. Напярэдадні рабочай паездкі, адказваючы на пытанні дэпутатаў пасля Паслання парламенту і народу, Прэзідэнт адзначыў, што палітыка ў плане пераадолення наступстваў аварыі на ЧАЭС будзе скарэкціравана, пастаўлена задача значна павысіць узровень жыцця людзей на поўдні і паўднёвым усходзе краіны і што паказальнай у гэтым плане будзе менавіта Магілёўская вобласць.

На комплексным падыходзе да развіцця ўсіх сфер жыццядзейнасці ў паўднёва-ўсходніх раёнах Магілёўскай вобласці, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу падчас рабочай паездкі ў Клімавічах на нарадзе па выкананні даручэння па сацыяльна-эканамічным развіцці ўсходніх раёнаў Магілёўскай вобласці, паведамляе БЕЛТА. СТАР. 2

*ЛІЧБА ДНЯ*

**9 млн 467 тыс. чалавек**

***склала колькасць насельніцтва Беларусі на 1 красавіка гэтага года.***

■ Надвор'е

## СОНЕЧНЫЯ ВЫХАДНЫЯ

**Аднак уначы яшчэ халаднавата**

**Гэтымі днямі тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў скандынаўскага антыцыклону, таму ўсталюецца малавоблачнае надвор'е, паведаміла карэспандэнту «Звязды» спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У суботу і нядзелю будзе пераважна без ападкаў, толькі ў нядзелю па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ў ноч на суботу складзе плюс 1—7 цяпла, у Брэсцкай вобласці — да плюс 10, а на ўсходзе краіны месцамі замаразкі да 0 — мінус 3 градусаў. У ноч на нядзелю чакаецца 3—10 цяпла. А вось удзень у выхадныя прыгрэе да плюс 16—22. Праўда, у заходніх раёнах у нядзелю месцамі будзе значна свяжэй — каля 13—16 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак па паўночна-заходняй палове рэспублікі пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ў ноч на панядзелак будзе 4—10 цяпла, удзень — плюс 16—22.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.04.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9980,00 | ▲ |
| Еўра | 13810,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 278,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 883,19 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Жыццё працягваецца

## «ЧАРНОБЫЛЬ ВЫБРАЎ НАС...»

**Жыхары Слаўгарадскага раёна навучыліся весці гаспадарку на забруджаных землях**

**Тацццяна Гурына і цяпер сумуе па тым часе, калі ў лесе за ракой Сож можна было смела збіраць чарніцы і суніцы. Смачныя ягады ў яе сям'і штогод сушылі вёдрамі на печцы, каб потым пад зімовыя завыванні завірухі піць духмяную гарбату каля грубкі. А які смачны суп атрымліваўся з баравікоў! Іх таксама ў слаўгарадскіх лясах было шмат. Некаторыя прадпрымальныя людзі нават мяшкамі вазілі каштоўныя нарыхтоўкі ў Маскву ці Ленінград і зараблялі на іх вялікія грошы. Сёння лясных дароў таксама хапае, але яны нясуць у сабе радыеактыўную атруту. Той злавесны красавіцкі дзень 1986 года, які прынёс з поўдня чорную хмару, цалкам змяніў звыклы лад жыцця.**

### ПАД РАДЫЯЦЫЙНЫМ КАЎПАКОМ

— Раніцай 1 мая мы разам з маленькай дачкой хадзілі на свята. Аб тым, што здарылася, даведаліся толькі вечарам у гэты ж дзень, — успамінае жыхарка Слаўгарада Таццяна Гурына, якая на той момант працавала ў райкаме партыі інструктарам ідэалагічнага аддзела. — Гэта цяпер любую інфармацыю можна знайсці ў інтэрнэце, а тады ніхто не ведаў, што рабіць. Спачатку нават не маглі сабе ўявіць маштабы той бяды, якая з намі здарылася. Здавалася, Чарнобыль далёка ад нас, але ж на самой справе гэта быў самападман. У ліпені школы цалкам пачалі адпраўляць у больш чыстыя раёны. Але праз месяц дзеці з настаўнікамі вярнуліся дадому. Трэба было неяк жыць далей. СТАР. 3

■ Тэхналогіі

## З «ПАЛЬЧЫКАМІ» Ў ПАШПАРЦЕ

**У Беларускім доме друку прадэманстравалі магчымы варыянт беларускага біяметрычнага пашпарта.**

Ад звыклага нам такое пасведчанне асобы адрозніваецца наяўнасцю спецыяльнай мікрасхемы, на якой захавана інфармацыя пра ўладальніка пашпарта. Гэта імя, імя па бацьку, прозвішча, дата нараджэння, адсканаваныя адбіткі пальцаў — у асноўным тое, што змяшчае і «звычайны» дакумент. Біяметрычныя пашпарты сёння выдаюць у многіх краінах свету, Беларусь пакуль на шляху да гэтага. З удзелам расійскіх партнёраў, адкрытага акцыянернага таварыства «НДІМЭ і Мікрон» і групы кампаній «Першы друкарскі двор», у Беларускім доме друку было сабрана 20 беларускіх пашпартоў з чыпам — эксперыментальных узораў. СТАР. 4



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Галоўная «дэталь» новага пашпарта — мікрачып на вокладцы.

# ТЭРЫТОРЫЯ ЖЫЦЦЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле слоў Прэзідэнта, дзякуючы прынятым мерам у апошні час змянілася стаўленне людзей на гэтых тэрыторыях: яны ўжо не хочуць нікуды ад'язджаць. Але ім патрэбна больш канкрэтная перспектыва — як будуць жыць, дзе будуць працаваць. «Менавіта таму патрабуецца комплексны падыход да развіцця ўсіх сфер жыццядзейнасці. І ў першую чаргу да нарошчвання патэнцыялу, каб забяспечыць чалавеку працу і годную аплату працы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Але, на думку кіраўніка дзяржавы, ад аблвыканкама «за словамі эфектыўных крокаў не было». Хоць фінансавых сродкаў і іншых рэсурсаў было выдаткавана нямала. Так, толькі ў 2013 годзе ў рамках Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2011 — 2015 гады і на перыяд да 2020 года ў Магілёўскі рэгіён у выглядзе субвенцый з рэспубліканскага бюджэту было накіравана каля Br400 млрд, але, як адзначыў Прэзідэнт, праблемы не здымаюцца з парадку дня.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што за сацыяльна-эканамічны стан адказваюць персанальна кіраўнікі вертыкалі. «На месцах усім трэба працаваць у поўную сілу, самастойна адшукваць дадатковыя рэсурсы, праяўляць ініцыятыву, а не сядзець і чакаць ад дзяржавы бюджэтных уліванняў», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. У кадравым забеспячэнні рэгіёна, на думку Прэзідэнта, таксама нямала праблем: недахоп спецыялістаў, цякучасць кадраў, стыль працы кіраўнікоў. «Нельга забываць, што ад узроўню падрыхтоўкі і кваліфікацыі кадраў залежаць поспехі ці правалы ў рабоце арганізацый».

Падчас наведвання Клімавіцкага раёна кіраўнік дзяржавы падзяліўся ўражаннямі ад убачанага з борта верталёта. Ён раскрытыкаваў аграрыяў за нізкую культуру земляробства. На яго думку, у цэлым «Магілёўская вобласць правальная па многіх параметрах».

Першым пунктам праграмы наведвання Клімавіцкага раёна была МТФ «Барысаўка» філіяла «Ніва-Агра» Клімавіцкага камбіната хлебапрадуктаў. Прэзідэнт пацікавіўся, як у рэгіёне ідзе працэс рэканструкцыі жывёлагадоўчых ферм і комплексаў. «Гэта лакмусавая паперка ў працы губернатараў», — сказаў ён. Аляксандру Лукашэнку расказалі, што ў Магілёўскай вобласці рэканструюецца 170 аб'ектаў. З іх 120 ферм і комплексаў пабудаваны, а яшчэ 20 будуць уведзены да 1 мая. Прэзідэнта запэўнілі, што рэканструкцыя на фермах Магілёўскай вобласці будзе завершана да 1 кастрычніка гэтага года. Як высветлілася, у ліку праблемных пытанняў — і своечасовае навучанне спецыялістаў для работы на мадэрнізаваных аб'ектах. Прэзідэнт запатрабаваў неадкладна вырашыць гэтую праблему.

На сустрэчы ішла размова аб неабходнасці павышэння эфектыўнасці работы жывёлагадоўлі, прычым не толькі малочнай галіны, але і свінагадоўчай. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў да канца года аднавіць вытворчасць свініны да самых высокіх паказчыкаў, патлумачыўшы гэта кан'юнктурай рынку, паколькі цэны на свініну сталі расці. Былі закрануты пытанні стварэння буйных холдынгаў па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі і развіцця садаводства.

Прэзідэнт наведаў таксама Клімавіцкі дзяржаўны аграрны каледж, дзе азнаёміўся з падрыхтоўкай кадраў для АПК. Аляксандр Лукашэнка наведаў вучэбныя класы і пагутарыў з навучэнцамі. Ён цікавіўся іх меркаваннем, што трэба зрабіць, каб больш моладзі заставалася працаваць на вёсцы. Кіраўнік дзяржавы параіў моладзі не спяшацца ў горад, а заставацца працаваць у сябе на радзіме.

❍❍❍

Па традыцыі, размаўляючы ў Клімавічах з мясцовымі жыхарамі, Прэзідэнт закрануў тэмы, найбольш актуальныя сёння ў грамадстве. У прыватнасці, гаворачы аб сітуацыі ў суседняй Украіне, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь не хацела б братазабойчай вайны і гібелі там людзей, адзначыўшы пры гэтым, што літаральна ў гэтыя месяцы ў Беларусь прыехалі 4,5 тысячы чалавек, з іх амаль 2 тысячы — з Украіны. Ён звярнуў увагу на тое, што не можа забараніць уезд у краіну, аднак у Беларусі сочаць за тым, хто едзе да нас. «Калі сем'ямі, то зразумела. Але можа ж хлынуць і крымінал сюды», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

А ў цэлым сітуацыю ў суседзяў Прэзідэнт лічыць вельмі сур'ёзнай. «Трэба стабілізаваць становішча. І Захаду, і Расіі неабходна ўціхамірыцца і зразумець адно: мы ў найвялікшай адказнасці за гэты кавалак зямлі, таму што там жыве ўнікальны народ, нашы людзі, славяне. І мы ў адказнасці за гэты народ, за яго культуру і яго развіццё. Нельга дзейнічаць на знішчэнне дзяржавы і гэтага народа», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы аб надзённых пытаннях нашай краіны, калі размова зайшла аб ахове здароўя, Прэзідэнт адзначыў, што дзяржава працягне надаваць першачарговую ўвагу развіццю аховы здароўя — яно будзе выведзена на самы высокі ўзровень не толькі ў чарнобыльскім рэгіёне, але і ва ўсіх кутках краіны. Ён таксама расказаў пра тое, што ў Беларусі мадэрнізавана ўся сістэма аховы здароўя. Пры гэтым найменшая ўвага пакуль што надаецца Мінску, але гэтая праблема ў бліжэйшы час будзе вырашана і ўсё будзе прыведзена ў парадак. Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што адукацыя і ахова здароўя — гэта адказнасць дзяржавы і гэтым кірункам надаецца найпершае значэнне.

■ Працоўны інтарэс

## «НАМ ХАЦЕЛАСЯ Б, КАБ СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА ПА КРАІНЕ ПЕРАСЯГНУЛА 532 ДОЛАРЫ»



**Аб гэтым заявіў журналістам старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід Козік перад урачыстым сходам прафсаюзнага актыву з нагоды 110-годдзя прафсаюзнага руху ў нашай краіне.**

— Самае галоўнае, што мы зрабілі — аднавілі сацыяльнае партнёрства і захавалі адзінства прафсаюзнага руху, — кажа Леанід Козік. — Роля прафсаюза ў сацыяльным партнёрстве з урадам вялікая. Разам нам удалося вырашыць шмат задач. Мы спакойна дамаўляемся з урадам, падпісваем пагадненні, а пасля назіраем, як яны выконваюцца. Калі б мы бегалі з транспарантам, то, паверце, гэтым нічога не дабіліся б.

Па меркаванні кіраўніка прафсаюзнага руху, вывесці людзей на вуліцу, арганізаваць пікет ці забастоўку — гэта крайні сродак, прымяняць які няма сэнсу. Бо задача прафсаюза — не даводзіць народ да такіх крайнасцяў. Пайсці на перамовы, на пагадненне, стварыць камісію, заключыць дадатковыя дагаворныя адносіны — выйсце з любой складанай сітуацыя можна знайсці дзясяткамі канструктыўных спосабаў.

Паводле слоў Леаніда Козіка, усе гэтыя гады прафсаюзы абаранялі правы беларусаў — на працу, на бяспечныя ўмовы працы, годную заработную плату, адпачынак, аздараўленне. Сёння ні адзін закон, які закранае працоўныя адносіны, не можа быць прыняты без узгаднення з Федэрацыяй прафсаюзаў.

— Наша галоўная задача — зрабіць так, каб чалавеку жылося лепш, — адзначыў Леанід Козік. — Я маю на ўвазе не ўладальніка атэля ці кіраўніка прадпрыемства, а простых людзей, якія там працуюць. Вядома, нам бы хацелася, каб заработная плата ў сярэднім па рэспубліцы была большай, чым 532 долары. Але для гэтага, зразумела, аднаго жадання мала. Трэба, каб эканоміка больш актыўна запрацавала.

**Сёння ні адзін закон, які закранае працоўныя адносіны, не можа быць прыняты без узгаднення з Федэрацыяй прафсаюзаў.**

Прафсаюзы не толькі змагаюцца за павышэнне заработнай платы, але і правяраюць, наколькі добрасумленна арганізацыі выконваюць працоўнае заканадаўства, дбаюць пра ахову працы.

— Статыстыка нас не вельмі радуе: у 2013 годзе была толькі на адзін выпадак са смяротным зыходам менш,чым у 2012-м, — кажа Леанід Козік. — Я думаю, што мадэрнізацыя прадпрыемстваў, якой у нашай краіне сёння надаецца шмат увагі, дапаможа знізіць узровень траўматызму. Разам з тым, замена састарэлага абсталявання, тэхналогій паспрыяе павышэнню прадукцыйнасці працы, ад якой напрамую залежыць заробак кожнага.

Шмат сіл прафсаюзы ўкладаюць у развіццё культуры і спорту.

— Мы маем на балансе 117 дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ, якія развіваем разам з дзяржавай, тры Палацы культуры, 13 санаторыяў, — расказаў Леанід Козік. — Для членаў прафсаюза і членаў іх сем'яў прадугледжана зніжка ў памеры 25% ад кошту пуцёўкі ў прафсаюзныя санаторыі. Атрымліваецца, што калі адпачываць едзе сям'я з чатырох чалавек, то адну пуцёўку яны атрымліваюць бясплатна.

Карыстаючыся магчымасцю, прафсаюзныя актывісты запрашаюць мінчан і гасцей сталіцы на святочную маёўку, якая, па традыцыі, арганізуецца Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі 1 мая. Сёлета ўрачысты мітынг з нагоды свята працы пачнецца ў 11 гадзін у сталічным парку імя Янкі Купалы.

— Мы разлічваем, што на мітынг прыйдуць некалькі дзясяткаў тысяч чалавек, — адзначае **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Аляксандр Мікша**. — І гэта не толькі прафсаюзныя актывісты прадпрыемстваў горада, але і простыя члены прафсаюза, звычайныя працаўнікі, для якіх Першамай з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця, гісторыі Беларусі.

Па традыцыі, святкаванне 1 Мая ў сталіцы не абыходзіцца і без прадстаўнікоў органаў улады, замежных гасцей. Прадстаўнікі дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Беларусі, а таксама міжнародных аб'яднанняў прафсаюзаў штогод прыходзяць на першамайскі мітынг, каб выказаць салідарнасць з працаўнікамі нашай краіны.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

■ Курсавая розніца

## Гавораць, як на скрыпцы граюць

**Рыторыка кіраўнікоў Еўрапейскага Цэнтрабанка дае супрацьлеглы вынік. Чым больш гавораць аб тым, што занадта моцны еўра прывядзе да зніжэння працэнтных ставак, тым больш моцным ён становіцца, бо ЕЦБ не пачынае ніякага змякчэння грашова-крэдытнай палітыкі.**

Той жа эфект падтрымлівае слабы долар, на які значна ўплывае канфлікт ва Украіне. Праблемы нашай паўднёвай суседкі адбіваюцца і на расійскай валюце. У перыяд перад Вялікаднем рубель узмацняўся, аднак адразу пасля свята, калі ўсход Украіны забурліў ізноў і Расія заявіла аб магчымым умяшальніцтве ў падзеі, валюта пайшла ўніз. Толькі, як паказваюць апошнія назіранні, на рубель трэба глядзець у доўгатэрміновай перспектыве — ён ужо значна аднавіўся пасля нядаўняга вялікага падзення. Гэта можа паўтарыцца.

А беларускі рубель яшчэ знізіўся. Аднак прыбліжэнне кошту долара да 10 тысяч многіх экспертаў не пужае. Кажуць, што, наадварот, таны рубель прастымулюе экспарт і выраўняе наша знешнегандлёвае сальда, якое прасела летась. Паглядзім. За тыдзень долар падаражэў на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 9980. Еўра падняўся на 40 рублёў (плюс 0,3%) да 13810. Расійскі рубель знізіўся на 2 грашовыя адзінкі (мінус 0,7%) да 278,5.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Абмяркоўваем Пасланне Прэзідэнта

## РАБОЧАЯ ПРАФЕСІЯ — ЛЕПШАЯ САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА

**Аркадзь ШКЛЯР, дырэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі:**

— Патокі выпускнікоў абавязкова трэба пераразмяркоўваць. Моладзь павінна зразумець, што ісці ў прафесійную школу пасля заканчэння 9-га класа выгадна. Можна прыводзіць эканамічныя разлікі, каб пераканаць бацькоў у правільнасці гэтага кроку. Прадастаўляць больш інфармацыі пра рабочыя прафесіі. Тлумачыць, што ў прафтэхустановах маладым людзям даюць прафесійны падмурак і штуршок у дарослае жыццё. І шанцы застацца без працы ў іх мінімальныя.

Над чым нам трэба працаваць — дык гэта над прэстыжам рабочых прафесій. Адсутнасць цікавасці з боку моладзі да авалодання такімі прафесіямі — тэндэнцыя, характэрная не толькі для Беларусі. Усе еўрапейскія краіны дапусцілі тыя ж памылкі, што і мы: там таксама маладыя людзі масава ішлі ва ўніверсітэты, а потым сутыкаліся з праблемай беспрацоўя. Затое сёння ў той жа Фінляндыі 60% выпускнікоў ідуць у прафесійную школу. Усё больш бацькоў аддаюць перавагу прафесійнай адукацыі ў Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі, Нідэрландах.

Я лічу, што чалавек, зарыентаваны на вышэйшую адукацыю, павінен дакладна сабе ўяўляць, ці можа ён яе атрымліваць, ці хапае яму для гэтага здольнасцяў і ведаў... Лічу, што Міністэрства адукацыі і Дзяржаўная камісія па кантролі за ходам уступных іспытаў прынялі вельмі правільнае рашэнне, калі павысілі парог для тых, хто паступае ў ВНУ. Трэба разумець, што вышэйшая адукацыя не можа быць даступнай такой колькасці людзей, якія на яе прэтэндуюць, нават з-за іх здольнасцяў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА КАРАНЁЎ

**Барыс ЛАЗУКА, загадчык аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі:**



Фота БЕЛТА.

— Для мяне, як навукоўца, даследчыка нацыянальнай культуры, вельмі важнае значэнне мае пазіцыя дзяржавы. Наш кіраўнік разумее, што для таго, каб пабудаваць моцную краіну, трэба звяртацца да сваіх каранёў, да тых добрых традыцый, якія нам засталіся ў спадчыну, трэба ўмацоўваць нашу духоўнасць. Абапіраючыся на народную культуру, можна спасцігнуць шмат мудрасці. Асабліва радуе тое, што гэта не толькі разуменне, але і рэальныя крокі ўлады. Прыклад таму — дзяржаўная праграма «Слуцкія паясы», зацверджаная ў канцы 2012 года. Мяне да сэрца кранае такое стаўленне Прэзідэнта і яго ўласная грамадзянская пазіцыя. Нядаўна Аляксандр Лукашэнка наведваў новы музей і фабрыку паясоў у Слуцку. Ён не толькі ацаніў тое, што ўжо зроблена, але і задаў пытанне: «А што далей?» Значыць, ён бачыць у гэтым рэальны патэнцыял. На гэтай сустрэчы Прэзідэнт звярнуўся да спецыялістаў, навукоўцаў, мастацтвазнаўцаў — такая ўвага ўсяліла ў нас аптымізм і надзею, мы пачулі ў гэтым асабістую задачу.

Адраджаючы слуцкія паясы, мы, магчыма, працуем на будучыя пакаленні. Аднак гэта і рэальная работа цяпер.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Факт

## Сок сказаў «стоп»

**Лясгасы краіны завяршылі нарыхтоўку бярозавіку.**

Сёлета было нарыхтавана 19,7 тысячы тон бярозавага соку, што на 33 працэнты больш, чым летась. Найбольшы аб'ём удалося сабраць лясгасам Брэсцкай і Мінскай абласцей — 5,45 тысячы тон і 5,12 тысячы тон, адпаведна. Гаспадаркі Магілёўскай вобласці нарыхтавалі 3,41 тысячы тон, Гродзенскай — 2,45 тысячы тон, Віцебскай — 2,05 тысячы тон. Менш за іншых змаглі сабраць бярозавіку лясгасы Гомельскай вобласці — усяго 1,21 тысячы тон.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## За сераду працуем у суботу

Працоўны дзень серада 30 красавіка пераносіцца на суботу 3 мая. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 25 лістапада 2013 года № 1012. Такім чынам, атрымліваецца, што на наступным тыдні будуць тры выхадныя дні — 29, 30 красавіка і 1 мая. «Арганізацыям прадастаўлена права з улікам спецыфікі вытворчасці (работы) ажыццяўляць перанос у іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам», — паведамляюць у прэс-службе беларускага ўрада.

# «ЧАРНОБЫЛЬ ВЫБРАЎ НАС...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэпараты з ёдам хутка сталі дэфіцытам. Казалі, што адна кропля на шклянку малака цалкам нейтралізуе небяспеку. Але хутка даведаліся, што малако назапашвае радыяцыю. Насельніцтва пачало масава збываць кароў. І гэта таксама было няпроста. У Магілёве, напрыклад, адмаўляліся іх прымаць. Тады людзі мылі сваіх цялушак і адпраўлялі ў Бабруйск ці Крычаў, дзе патрабаванні былі менш жорсткімі.

У той год жыхарам раёна наогул прыйшлося цалкам перагледзець свой рацыён. Вельмі карыснымі аказаліся парады амерыканскага доктара Роберта Гейла — таго самага, які дапамагаў аперыраваць у Маскве пацярпелых ад атамнай радыяцыі ратавальнікаў. Яго падрабязныя рэкамендацыі, што можна есці, а што нельга, у раёне перапісвалі нават ад рукі. Адразу выключылі з дзіцячага харчавання булёны з касцей — там назапашваўся стронцый, а мяса, каб знізіць наяўнасць цэзію, вымочвалі ў саляных растворах. Кожны імкнуўся ўжываць чыстыя прадукты, якія завозілі ў крамы. Некаторыя наогул спрабавалі адмовіцца ад ўсяго беларускага, але гэта было вельмі цяжка.

Хапала і такіх, якія недаацанілі небяспеку. Таццяна Гурына разам з іншымі спецыялістамі ездзіла па навакольных вёсках правяраць санітарныя ўмовы і праводзіць інструктаж, як жыць на забруджаных тэрыторыях, і наглядзелася ўсякага. Запомніла, як аднойчы прыехалі да механізатараў у інтэрнат, а там усюды бруд, пясок. Санітарны ўрач нават абурыўся: што ж вы, хлопцы, сваё здароўе не глядзіце?

## ПАХАВАНЫЯ ВЁСКІ

— Памятаю, як высялялі Чырвоную Слабаду. Гэта быў жах, — успамінае старшыня Лапаціцкага сельвыканкама Сцяпан Байцоў. — Адзін падпалкоўнік замераў радыяцыю і ахнуў: дык тут жа 65 Кюры! Людзі плакалі, паніка была ад няведання: як, куды, навошта? У Чырвонай Слабадзе жылі 240 чалавек, яшчэ ў адной вёсцы — Кашалеў, якая трапіла пад высяленне, — 18. Збіралі сходы, тлумачылі людзям. Думалі разам, куды пераселяцца. Жыхары баяліся кідаць нажытыя месцы, але калі дзве жанчыны пераехалі, рызыкнулі і іншыя. Памятаю, да апошняга заставаліся толькі дзве сястры, але калі пачалі закопваць дамы, яны таксама не вытрымалі і перасяліліся ў Малую Бароўку, што пад Магілёвам. У мяне там сястра жыла. Прыехаў аднойчы да яе і гэтых жанчын сустрэў. Яны як убачылі мяне — заплакалі, кінуліся абдымацца, быццам да роднага. Я нават сам заплакаў. Сэрца і цяпер баліць па тых вёсках. Чырвоная Слабада вельмі прыгожая была. Дамы стаялі на беразе Проні, заможныя такія, жыхары былі скрозь гаспадары. Добрая


«Адраджэнне-Агра» аб'яднала ініцыятыўных людзей. Сцяпан Байцоў другі злева.

ферма мелася, зусім яшчэ новая, школа, клуб... Цяпер на гэтым месцы лес расце. Толькі могілкі і засталіся. Людзі прыязджаюць на Радаўніцу.

## СТРАШНЕЙШЫ ЗА РАДЫЯЦЫЮ ТОЛЬКІ СТРЭС

Адна за адной зніклі з твару зямлі слаўгарадскія вёскі Запалянне, першая і другая Кулікоўкі, Кульшачы, Кліны... Кульшачы, напрыклад, цалкам перасяліліся ў вёску Заеліца Глускага раёна. Людзі стварылі там калгас «Слаўгарадскі». Але некаторыя ўсё роўна імкнуліся вярнуцца на радзіму.

Таццяна Гурына разам з сям'ёй вырашыла застацца ў Слаўгарадзе. А вось іх бліжэйшыя суседзі паехалі ў Гродзенскую вобласць, але праз 2 гады вярнуліся назад. Яны так і не сталі там сваімі. Добрых і разумных людзей, зразумела, шмат, але знаходзіліся і такія, якія балюча папракалі: вы ж ад радыяцыі свеціцеся...

На здароўе суразмоўца не скардзіцца, але лічыць, што радыяцыя ўсё ж паўплывала на імунітэт. Прастудныя захворванні цяжэй пераносяцца. Памятае, што ў школе, дзе яна працавала ў 1990-я гады, вучылася дзяўчынка, якой цалкам выдалілі шчытападобную залозу, яшчэ адзін хлопчык хварэў на лейкемію. Але сцвярджаць, што паміж захворваннямі і радыяцыяй ёсць нейкая ўзаемасувязь, могуць толькі спецыялісты.

— Мяне таксама запрашалі на працу ў Дрыбін, — успамінае 1990-я гады Сцяпан Байцоў. — Прыехаў, паглядзеў на той недабудаваны дом, які мне прапанавалі, — голыя сцены, вакол гліна — і сэрца адмовілася, запрасілася назад, у Лапацічы, дзе ў мяне было ўжо ўсё. Радыяцыя, вядома, ускладніла жыццё. Памятаю, прыехалі да нас японцы, «прагналі» праз свае спектрометры выпраменьвання чалавека і праз 10 дзён я быў ужо ў Кіславодску. Ніхто нічога не тлумачыў, адправілі — і ўсе. І такіх нас назбіралася 8 чалавек. Я быў маладым, 29 гадоў усяго, балюча ставіўся да ўсіх забарон. А іх існавала шмат: радонавыя і гразевыя ванны нельга, фізіяпрацэдуры таксама, салярый і нават звычайнае сонца — ні ў якім выпадку.

— Аднойчы да нас у школу прыехалі псіхолагі для вывучэння ўзроўню трывожнасці сярод настаўнікаў і вучняў. Ва ўсіх нас ён быў павышаны, — адзначае Таццяна Гурына. — Мы думалі, што забываем, але на ўзроўні падсвядомасці нешта ўсё роўна засталося. Толькі і тыя, хто з'ехаў, таксама не выратаваліся. Шмат хто памёр. Нездарма кажуць, што стрэс страшнейшы за радыяцыю.

## АДРАДЖЭННЕ

Для хатніх гаспадарак Слаўгарада і раёна тым самым выратавальным колам сталі праекты па адраджэнні забруджаных тэрыторый, якія праводзяцца як дзяржавай, так і грамадскімі арганізацыямі. Такімі, як фонд развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра». У Слаўгарадзе апошнія 4 гады яго ўзначальвала Таццяна Гурына. Яшчэ да таго, як стаць дырэктарам, яна ў складзе іншых актыўных яго членаў вучылася вырошчваць экалагічна чыстую прадукцыю на атручанай радыенуклідамі глебе. Кажа, што гэта сапраўды мела плён. Калі ўносіш навукова абгрунтаваныя нормы ўгнаенняў, тады расліна замест радыеактыўнага цэзію пачынае паглынаць калій, а замест стронцыю — кальцый. У выніку атрымліваеш чысты прадукт. «А наогул мы ажыццявілі 8 карысных праектаў, — адзначыла Таццяна Аляксееўна. — Адным з іх стала стварэнне пярвічнай арганізацыі «Сяльчанка,» якая аб'яднала ініцыятыўных жанчын і дазволіла ім сумеснымі намаганнямі стварыць годныя ўмовы жыцця ў вёсцы. Мы можам ганарыцца тым, што зрабілі свой унёсак ва ўстойлівае развіццё сваёй тэрыторыі».


Таццяна Гурына адзначана за крэатыўнасць на міжнародным узроўні.

Дарэчы, «за жаночую крэатыўнасць у сельскім жыцці» Таццяна Гурына, адзіная ў Беларусі і другая ў маштабах СНД, атрымала ў 2012 годзе міжнародную прэмію ад жаночага фонду Сусветнага саміту (WWSF). Гэтая адзнака на міжнародным узроўні яшчэ раз пераканала ў правільнасці абранага шляху.

«Так што былой разгубленасці ў нас няма, — аптымістычна кажа Таццяна Гурына. — Цяпер мы ведаем, як жыць далей. А ўпэўненасць заўсёды дае сілы».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

# РЫБУ НА РАДЫЯЦЫЮ ПРАВЕРАЦЬ У ШКОЛЕ

**Усе жыхары Роўкавічаў і суседніх вёсак добра ведаюць, што прадукцыю, вырашчаную на падворках ці сабраную ў лесе, абавязкова трэба праверыць — «на радыяцыю». І ехаць у райцэнтр — Чачэрск — для гэтага зусім не абавязкова. Трэба проста прыйсці ў мясцовую сярэднюю школу. Больш за тое, дакладную інфармацыю ім прадставяць вучні, якія пад кіраўніцтвам дарослых апрацуюць матэрыял, правядуць нагляднае даследаванне на адпаведным прыборы і выдадуць дазвол або забарону на ўжыванне прадукту.**


Вучаніцы восьмага класа Лана МЕЛКАЗЁРАВА і Аксана ДАЎГАЦЕЛЕС пад кіраўніцтвам настаўніка хіміі і біялогіі Сяргея КАСЦЮКОВА правяраюць рыбу, вылаўленую ў рацэ Чачоры.

Вось і цяпер вучаніца восьмага класа Лана Мелказёрава прынесла ў школу рыбу, якую напярэдадні вылавіў яе бацька ў рацэ Чачоры. Праверку дзяўчына робіць разам з сяброўкай Аксанай Даўгацелес і выкладчыкам хіміі і біялогіі Сяргеем Касцюковым. Ён, дарэчы, адзін з кіраўнікоў аб'яднання па інтарэсах «Азбука радыяцыйнай бяспекі» — разам з настаўнікам інфарматыкі Васілём Рудабельцам. Увогуле ж такія карысныя вопыты стала магчымым праводзіць дзякуючы адкрыццю летась у гэтай установе адукацыі цэнтра практычнай радыелагічнай культуры, створанаму ў межах праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Women's Federation for World Peace, International». Праект рэалізуецца Інстытутам радыяцыйнай бяспекі «Белрад».

Тэма радыяцыйнай бяспекі застаецца для Чачэршчыны вельмі актуальнай — гэты рэгіён знаходзіцца на забруджанай у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС тэрыторыі.

Тут з першага класа вучням расказваюць пра асаблівасці жыцця на зямлі, забруджанай радыенуклідамі. І ўжо ў пачатковай школе дзеткі ведаюць пра ўплыў нябачнай вокам радыяцыі на арганізм чалавека. Але інфармацыя падаецца не для таго, каб запужаць — каб навучыць жыць правільна і ўжываць толькі чыстыя прадукты харчавання. Школьнікі добра арыентуюцца, якія радыенукліды ўяўляюць самую вялікую небяспеку, да якіх наступстваў для прыроды Беларусі прывяло забруджванне навакольнага асяроддзя прадуктамі чарнобыльскага выкіду, знаёмяцца са спосабамі зніжэння радыяцыйнага ўздзеяння на арганізм чалавека... Намеснік дырэктара па навучальна-выхаваўчай рабоце УА «Роўкавіцкі яслі-сад—сярэдняя школа» Таццяна Антропава расказвае, што ўсе жыхары наваколля добра ведаюць шлях у школу — менавіта з мэтай праверкі сюды нясуць дары лясоў і палёў — у залежнасці ад сезона:

— Прыносяць малако, мяса, мёд, бярозавік, грыбы, ягады, нават сена, якое даюць свойскай жывёле. Даволі часта высвятляецца пасля такой праверкі, што колькасць радыенуклідаў у прадукце ў некалькі дзясяткаў разоў перавышае дапушчальную норму. Часцей за ўсё гэта — ягады і грыбы. Летась адзін наш вучань прынёс для праверкі бульбу са свайго агарода, які знаходзіцца ў суседняй вёсцы Крутое — гэта 5 км ад Роўкавічаў. Высветлілася: агародніна вельмі забруджаная. Мы звязаліся з бацькамі і растлумачылі, што нельга саджаць бульбу на тым полі. Многія сем'і прыслухоўваюцца да нашых парад і знішчаюць забруджаныя прадукты харчавання.

Старшакласнікі і настаўнікі па спецыяльных табліцах дапушчальных нормаў дапамогуць аднавяскоўцам праверыць інфармацыю. Напрыклад, заўважана, што малако ад вясковых кароў калі і змяшчае радыенукліды, дык у межах дапушчальных нормаў. А вось на чарніцы лепш не марнаваць час — давядзецца выкінуць, бо вельмі часта яны забруджаныя.

У межах работы цэнтра практычнай радыелагічнай культуры наладжана супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі. Установу адукацыі наведвалі французская і японская дэлегацыі. Яе ўдзельнікаў цікавілі праблемы пражывання людзей на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях. Вынікам супрацоўніцтва стаў абмен досведам работы ў гэтым кірунку.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Актыўны адпачынак

# ПА ВАЛОЖЫНСКІХ ГАСЦІНЦАХ НА ВЕЛАСІПЕДАХ

**У Валожынскім раёне для беларускіх і замежных турыстаў падрыхтавалі прыемны сюрпрыз. Велатур па «Валожынскіх гасцінцах» можна будзе здзейсніць, пачынаючы з мая.**

— Ідэя стварэння асобнага веламаршруту па Валожынскіх гасцінцах лунала даўно, — распавядае **старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА.** — Першы невялікі размечаны кальцавы веламаршрут працягласцю 20 кіламетраў з'явіўся ўжо ў 2010 годзе вакол сядзібы «Марціновы Гусь». А ў 2013-м уладальнікі некалькіх аграсядзіб, прадстаўнікі БГА «Адпачынак у вёсцы» пры падтрымцы Мінскага веласіпеднага таварыства і Валожынскага райвыканкама вырашылі пракласці веламаршрут ад станцыі Багданаў праз увесь Валожынскі раён да станцыі Радашковічы.

Гэтая ініцыятыва стала развівацца дзякуючы праекту «Развіццё турыстычных кластараў у Беларусі». Працягласць маршруту — каля 150 кіламетраў. Стваральнікі маршруту пастараліся ўключыць у яго самыя цікавыя месцы Валожынскага краю: экамузеі, аграсядзібы, прыродныя і гістарычныя славутасці. Валанцёры-веласіпедысты размецілі трасу. Усталяваны альтанкі для адпачынку і інфармацыйныя стэнды. «Валожынскія гасцінцы» — гэта першы і пакуль адзіны мадэльны турысцка-экскурсійны маршрут па сельскім турызме ў Беларусі. Ён, спадзяецца Валерыя Кліцунова, паслужыць прыкладам для стварэння іншых падобных маршрутаў.

**Надзея ДРЫЛА.**

**ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» извещает акционеров о проведении 8 мая 2014 года внеочередного общего собрания акционеров.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О приобретении Обществом акций собственного выпуска.

Собрание состоится по адресу: г. Гомель, ул. Лещинская, 49. Регистрация участников собрания с 13.30 до 13.55 по месту проведения собрания. При себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Начало работы собрания – 14.00. Справки по телефону: 44-10-17.

С материалами к собранию можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник-пятница) с 28 апреля по 08 мая 2014 года в ПЭО с 9.00 до 16.00.

**Генеральный директор** **Ю.В. Главатский**

**Главный бухгалтер** **С.М. Мелещева**

*УНП 400078768*

■ Маладая змена

# КАЛІ СЛОВА ТРАПЛЯЕ Ў ЦЭЛЬ

## Пераможцы конкурсу на лепшую публікацыю ваенна-патрыятычнай тэматыкі ў творчасці абапіраліся на сямейныя гісторыі

**Падчас XVIII Міжнароднай спецыялізаванай выставы «СМІ ў Беларусі» каля стэнда нашай газеты адбылося ўрачыстае ўзнагароджванне пераможцаў і лаўрэатаў штогадовага творчага конкурсу рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны на лепшую публікацыю ваенна-патрыятычнай тэматыкі.**



Падчас урачыстага ўзнагароджвання пераможцаў і лаўрэатаў конкурсу.

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

На працягу года маладыя аўтары з усёй краіны дасылалі ў рэдакцыю свае творы. Школьнікі разважалі аб падзеях нашай слаўнай ваеннай гісторыі, выказвалі свой погляд на сучасную армію, расказвалі пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Сімвалічна, што ў год 70-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ветэранская тэма гучала асабліва часта. Аўтары пісалі пра ваенныя лёсы сваіх дзядоў і прадзедаў, аднавяскоўцаў, якія ўнеслі ўклад у справу барацьбы з ворагам.

— Сімвалічна, што ўжо другі год запар вынікі конкурсу падводзяцца напярэдадні Дня Перамогі, а сёлета яшчэ і ў год 70-годдзя вызвалення, — зазначыў **начальнік упраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь Уладзімір МАКАРАЎ.** — У гэтым годзе яшчэ адна юбілейная дата, якую не варта забываць. 14 лістапада 1939 года ў законе БССР было літаральна сказана: «аб'яднаць вялікі беларускі народ у адзінай беларускай дзяржаве». Сімвалічна і тое, што ініцыятарам конкурсу выступіла газета «Звязда» — легенда Беларусі, адно з найбольш яркіх выданняў у нашай гісторыі. У самы трагічны перыяд, калі вырашалася пытанне, быць ці не быць беларускаму народу, «Звязда» была адзінай газетай, якая выходзіла на тэрыторыі Беларусі і разам з людзьмі змагалася з ворагам. Таму ўклад «Звязды» ў Вялікую Перамогу бясспрэчны. Ёсць і яе заслуга ў тым, што сёння ў Беларусі мір і стабільнасць, у нас цудоўная моладзь, арыентаваная на будучыню, дабрыню і стварэнне, якая верная нашым традыцыям, свята шануе подзвіг вялікага беларускага народа.

Па рашэнні журы пераможцы і найбольш актыўныя ўдзельнікі конкурсу былі ўзнагароджаны дыпломамі, граматамі і памятнымі падарункамі. Тыя, хто не змог паўдзельнічаць ва ўрачыстым мерапрыемстве, атрымаюць свае ўзнагароды па пошце.

Дыпломам першай ступені ў намінацыі «За творчасць і арыгінальнасць пры падрыхтоўцы публікацыі» ўзнагароджаны **вучань 10 класа Галубіцкай сярэдняй школы Петрыкаўскага раёна Мікалай Літоўкін** за публікацыю «Салдат Перамогі», а дыпломам другой ступені ў гэтай жа намінацыі — **вучань 8 класа Вучэбна-педагагічнага комплексу «Рытанскі дзіцячы сад — сярэдняя школа» Астравецкага раёна Алег Кураш** за публікацыю «Подзвіг у мірны час». Дыплом першай ступені ў намінацыі «За арыгінальнасць ідэі пры падрыхтоўцы рэпартажу» атрымала **адзінаццацікласніца Градзянецкай сярэдняй школы Асіповіцкага раёна Святлана Сергіевіч** за публікацыю «Роздум ля абеліска».

Па рашэнні журы найбольш актыўныя ўдзельнікі конкурсу і аўтары цікавых матэрыялаў, якія не сталі пераможцамі, узнагароджаны граматамі. Іх работы не былі менш змястоўнымі, але з розных прычын не адпавядалі патрабаванням, што былі акрэслены ў палажэнні.

Граматамі ўзнагароджаны студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта **Дар'я Кізянкова** за публікацыю «Яшчэ раз пра патрыятызм», вучань 9 класа Трокеніцкай базавай школы Астравецкага раёна **Яўген Тамашэвіч** за публікацыю «Мой абавязак — ведаць!», вучаніца 8 «А» класа сярэдняй школы № 4 г. Навапалацка **Аліса Каспуціс** за публікацыю «Дзеці вайны», вучань 7 класа сярэдняй школы № 4 г. Клімавічы **Аляксей Іванцоў** за публікацыю «Гераічнае мінулае ветэранаў», вучаніца 10 класа Вярэйкаўскай сярэдняй школы Ваўкавыскага раёна **Наталля Харытонік** за публікацыю «Франтавыя дарогі Васіля Зайцава», вучань 6 класа Вучэбна-педагагічнага комплексу «Рытанскі дзіцячы сад — сярэдняя школа» Астравецкага раёна **Максім Дэнюш** за публікацыю «Горкая праўда».

— Пра конкурс мне расказала мая цётка, якая выпісвае «Звязду», — прызналася **лаўрэат конкурсу Дар'я КІЗЯНКОВА.** — Думаць, пра што ж напісаць, доўга не прыйшлося. Пра вайну шмат расказвалі мае бабуля і дзядуля, якія хоць і былі малымі, але ўсё памятаюць. Тое, што ўвайшло ў публікацыю, — толькі малая частка з гісторыі нашай сям'і. Але такіх сем'яў у Беларусі вельмі шмат. Маё пакаленне абавязана шанаваць сваю гісторыю, той подзвіг, які здзейснілі нашы продкі. Невыпадкова мы даглядаем магілы невядомых салдат, удзельнічаем у шматлікіх акцыях памяці, дапамагаем ветэранам вайны. Гэта наш доўг, наш абавязак.

Так лічыць і **пераможца конкурсу ў намінацыі «За творчасць і арыгінальнасць пры падрыхтоўцы публікацыі» Мікалай ЛІТОЎКІН.** У публікацыі, за якую ён атрымаў узнагароду, юнак расказаў пра свайго аднавяскоўца, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Пятра Пінчука. Школьнікі ніколі не абыходзяць хату франтавіка: дапамагаюць па гаспадарцы, расказваюць пра свае поспехі, слухаюць аповеды пра вайну. Лёс Пятра Адамавіча настолькі ўразіў дзесяцікласніка, што той вырашыў распавесці аб гэтым і нам. Неўзабаве матэрыял пра гэтага ўнікальнага чалавека з'явіўся і на старонках «Звязды».

Арганізатары конкурсу выказваюць шчырую ўдзячнасць маладым аўтарам за праяўленую ўвагу да пытанняў беларускай арміі і абароны Айчыны, за жаданне расказаць пра ўдзельнікаў і сведак гераічных падзей Вялікай Айчыннай вайны. Вашы творы будуць публікавацца на працягу года на старонцы «Плацдарм» у рубрыцы «Конкурс».

Пераможцы за мінулы год вызначаны, але наш конкурс працягваецца. З палажэннем можна пазнаёміцца на нашым сайце. Дасылайце свае матэрыялы на беларускай мове на адрас рэдакцыі: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а, рэдакцыя газеты «Звязда»; e-mail: info@zvyazda.minsk.by (з паметкай «На конкурс»).** Пішыце! Шанц перамагчы ёсць у кожнага.

**Вераніка КАНЮТА**

# З «ПАЛЬЧЫКАМІ» Ў ПАШПАРЦЕ


Прэзентацыю адкрыў генеральны дырэктар Беларускага дома друку Раман АЛЕЙНІК.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Кожны чып для пашпарта, нягледзячы на свой невялікі памер, па магутнасці супастаўны з настольным камп'ютарам 90-х гадоў. Сёння чыпу дастаткова мець 72 кілабайты вольнай памяці, а сам ён каштуе каля двух еўра, — распавёў **начальнік аддзела прасоўвання сродкаў ідэнтыфікацыі ААТ «НДІМЭ і Мікрон» Анатоль РЭЗНІК.** — У канцы года мы плануем выпусціць мікрасхему з аб'ёмам памяці, большым за цяперашні ўдвая. Магчыма, акрамя адбіткаў пальцаў, у будучыні спатрэбіцца запісваць такія індывідуальныя ідэнтыфікатары, як радужная абалонка вока ці профіль вуха.

Вытворцы мікрасхем запэўніваюць, што ўся інфармацыя на чыпе надзейна зашыфравана і абаронена ад несанкцыянаванага доступу.

Узор беларускага біяметрычнага пашпарта на выгляд не адрозніваецца ад дакумента, які зараз ёсць у беларускіх грамадзян, — згаданая мікрасхема незаўважная. Спецыялісты тлумачаць, што "электронная начынка" будзе "зашытая" ў вокладку. У Расіі, напрыклад, для гэтага маецца спецыяльная пластыкавая старонка.

— Для таго, каб унесці даныя ў біяметрычны пашпарт, з абсталявання нам патрабуецца камп'ютар, спецыяльны прынтар, ламінатар, лічбавая фотакамера і сканер адбіткаў пальцаў, — растлумачыў намеснік дырэктара па тэхналогіях ідэнтыфікацыі групы кампаній "Першы друкарскі двор" Ілья Увараў.

Тут жа ён з памочнікамі прадэманстраваў увесь працэс запісу асабістых даных у дакумент і працэс счытвання інфармацыі з дапамогай спецыяльнага абсталявання і праграмнага забеспячэння. Для пачатку дзяўчыну, што згадзілася «атрымаць пашпарт», папрасілі назваць прозвішча, імя, імя па бацьку і іншыя звесткі, якія пазначаюць у пасведчанні асобы, затым зрабілі фота і адсканавалі адбіткі пальцаў. Праз нейкі час гэтая інфармацыя ўжо была запісана на чып, а прынтар надрукаваў узор нашага пашпарта, які накіравалі ў ламінатар.

Каб паказаць, як "працуе" біяметрычны пашпарт, яго заставалася толькі паднесці да спецыяльнай прылады, што счытвае асабістыя звесткі, а палец зноў прыкласці да сканера, каб сістэма супаставіла адбіткі. Дарэчы, праграма запрошвае спецыяльны код, які ўводзіцца з пашпарта ўручную, толькі пасля гэтага прылада зможа прачытаць чып.

Ці чакаць у хуткім часе ўвядзення ў Беларусі біяметрычных пашпартоў? Прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў, якія таксама прысутнічалі на прэзентацыі, пра тэрміны і саму верагоднасць гэтага нічога сказаць не змаглі. Гаварыць пра пераход Беларусі на новы тып пасведчання асобы можна будзе толькі тады, калі на гэты конт будзе прынята палітычнае рашэнне.

— Тэма біяметрычнага пашпарта не першы год абмяркоўваецца ў нашай краіне, у тым ліку і на самым высокім узроўні, за гэты час мы зрабілі нямала ў плане працы з узорамі біяметрычнага пашпарта, які ў будучыні, магчыма, увядуць і ў Беларусі, — адзначыў намеснік генеральнага дырэктара па спецвытворчасці выдавецтва "Беларускі дом друку" Андрэй Лук'янчыкаў.

Ён паведаміў, што за апошнія некалькі гадоў даводзілася вырабляць самыя розныя варыянты ўзораў біяметрычнага пашпарта: з "убудаваным" у вокладку чыпам, з полікарбанатнай старонкай і г.д. Каб у будучыні працэс вытворчасці пасведчання асобы новага тыпу не выклікаў цяжкасцяў, на прадпрыемстве імкнуцца напрацоўваць вопыт у гэтай справе.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

■ Наш кашалёк

# ЗА ГРОШЫ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ

**Атрымаць пазыку ў банка без даведкі аб даходах цяпер немагчыма. Гэта вынікае з патрабавання, якое змешчана ў пастанове Нацбанка, апублікаванай учора на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

У дакуменце гаворыцца аб тым, што «...ацэнка банкам крэдытаздольнасці фізічнай асобы для прыняцця рашэння аб прадастаўленні яму крэдыту, а таксама аб заключэнні дагавора фінансавання пад саступку грашовага патрабавання (факторынгу) з юрыдычнай асобай ці індывідуальным прадпрымальнікам, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль, па грашовым абавязацельстве фізічнай асобы ажыццяўляецца пры наяўнасці аднаго ці некалькіх наступных дакументаў...» Такім чынам, доказам плацежаздольнасці пазычальніка могуць служыць даведка аб памеры зарплаты, пенсіі, штомесячнага грашовага забеспячэння або адраснай сацыяльнай дапамогі, а таксама іншыя дакументы, якія пацвярджаюць атрыманне даходу.

Як гэту навіну ацэньваюць самі банкі? Па словах **начальніка ўпраўлення рознічных паслуг Белаграпрамбанка Аляксандра ЛЯДЗЯНА,** гэтая мера акажа свой уплыў на сегмент так званых «хуткіх» крэдытаў. «У практыцы Белаграпрамбанка дакумент, які пацвярджае даходы крэдытаатрымальніка, быў і застаецца неад'емным элементам сістэмы ацэнкі крэдытнай рызыкі па рознічных пазычальніках. Вядома, магчымасць прадаць крэдыт чалавеку наўпрост «тут і цяпер», пакуль ён ахоплены эйфарыяй ад жадання хутчэй атрымаць новы тэлевізар ці мабільнік, падаецца прывабнай з пункту гледжання магчымасцяў па продажах крэдытаў. Аднак мы заўсёды ацэньваем і адваротны бок такога крэдытавання — у выглядзе павышанай цаны крэдытаў, якая выліваецца ў дадатковую нагрузку на кліента, а таксама можа ў выніку адбіцца на якасці крэдытнага партфеля банка», — гаворыць спецыяліст.

Прыкладна той жа думкі прытрымліваецца ў Ідэя Банку. На нядаўняй прэс-канферэнцыі з нагоды 10-годдзя ўстановы **старшыня праўлення Ідэя Банка Таццяна МЯДЗВЕДЗЕВА** сказала, што, на яе погляд, абавязковае прадастаўленне кліентам даведкі аб даходах можа толькі палепшыць сітуацыю з крэдытнай рызыкай для банкаў. «А для самога кліента, які вырашыў атрымаць крэдытную падтрымку, атрыманне даведкі аб даходах не з'яўляецца вялікай праблемай».

«Вядома, гэтае новаўвядзенне скароціць колькасць крэдытаў і растэрміновак, якія выдаюцца непасрэдна ў крамах. Таму гэтыя змены больш турбуюць нашых партнёраў», — лічыць **намеснік старшыні праўлення Ідэя Банка Таццяна САМОЙЛЕНКА.**

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Мова маці

# ВОСЬ ТАКІЯ... ХІМЕРА́ДЫ

**...І сапраўды, па-рознаму складаюцца людскія лёсы: я нарадзілася і, можна сказаць, вырасла ў Беларусі, потым некалькі дзесяцігоддзяў жыла за межамі яе — размаўляла і пісала па-руску, па-ўкраінску. Можа, таму цяпер, вярнуўшыся на радзіму, так прагна слухаю людскія размовы, так радуюся кожнаму роднаму слоўцу.**

## Хацела, як лепей...

Прыгарадны аўтобус «Бабовічы—Гомель» спыніўся на чарговым прыпынку. Пасажыры сталі падымацца ў салон, а адна бабуля — дык нават каракацыца, бо сталага веку, бо з вельмі важкімі сумкамі і, відавочна, з унучкай...

Узяўшы ў кіроўцы адзін білет, яны разам рушылі ў салон, але адышлі недалёка: хтосьці падхапіўся, саступіў ім месца. Дзяўчынка села. Сама ж бабуля, ухапіўшыся за парэнчу, завяла размову з іншай кабетай.

— Куды гэта ты, Сцяпанаўна? — папыталася тая. — Ды з такою паклажай... Сумкі важкія ў цябе! Можа, на курорт дзе едзеш?

— Ну ты прыдумаеш... Гэта ж дачка пазваніла, папрасіла ўнучку прывезці, бо сама не ўпраўляецца. Заадно сказала бялізну сабраць, каб у машыне вымыць. Але ж я і сама пры сіле яшчэ — памыю, на копанцы выпалашчу, на ветры пасушу. Гэта ж не ў горадзе на балконе... Ад яе потым не здыхацца — нейкім гарам тхне... Дык я — замест шмацця — во бульбы набрала.

— А ці ўрадзіла ж? — цікавілася спадарожніца.

— Яшчэ і як, даражэнькая, бо я свой агарод з восені пераганоем «услала». Мужыкі з фермы прывезлі... І садзіла пасля Дабравесця. Вось яна і шуганула: не паверыш, нібы на дражджах расла! «Скарбу» — па дзесяць-дванаццаць бульбін пад кожным кустам было! І вялікія — па кулаку! На дранікі дужа добра: яны як сонейкі выходзяць — жоўценькія... І «Кіеўскі світанак» заўсёды саджу. Смачная бульба, сопкая — уся чыста рассыпаецца. Яе нісчымніцай есці можна... Дык і падумала, што ўсё роўна ж еду, дык чаму з пустымі рукамі? Узяла трохі «Скарба» — на драначкі, трохі таго «Світанка» — на салонікі...

— А ў мяне сёлета бульба не ўрадзіла, — заўздыхала спадарожніца. — Мусіць, сын падвёў. Прыехаў неяк — мне жукоў патруціў. Я і спакойная. А праз тыдзень глянула — тым жукам анігадкі: некаторыя калівы — аж руховыя, а меншанькія дык і зусім ужо голыя — адны цурбалкі тырчаць...

Жанчыны так захапіліся размовай, што, здаецца, не заўважылі, як аўтобус спыніўся, як у пярэднія дзверы зайшлі дзве маладыя кабеты ў камізэльках кантралёраў.

— Калі ласка, — гукнулі ў салон, — падрыхтуйце для праверкі білеты.

Пасажыры заварушыліся: нехта палез у кішэнь, нехта — у сумку, нехта ў кашалёк...

— А чыя ж гэта дзяўчынка? — спытала адна з кантралёрак.

— Мая... Унучка! — з форсам адказала Сцяпанаўна. — Ёй білета не трэба яшчэ: сямі гадоў нямашака.

— Бабуля, ну ты скажаш, — на ўвесь салон абурылася рапам малая. — Якія сем? Я ж у трэці клас перайшла! Ты што — забылася?

— Так-так... Склероз у мяне, выбачайце старую, — стала выкручвацца бабуля. — Гэта ж трэба — пераблытала ўнучак: маёй меншанькай, і праўда, сямі гадоў няма. А я ж сёння з большай еду...

— Баб, ты што — ачумела? — зноў на ўвесь аўтобус заявіла дзяўчынка. — У цябе ж адна дачка — мая мама. І адна ўнучка — гэта я. Няма ў мяне сястрычак — ні меншанькіх, ні большанькіх!

Аўтобус аж затросся ад смеху! Сцяпанаўна, густа пачырванеўшы, моўчкі пазірала то на ўнучку, то на жанчыну-кантралёра.

— Пяць гадоў працую на лініі, а *хімерадаў* такіх не бачыла, — разам з усімі засмяялася тая. — Глядзіце, бабуля: яшчэ раз без білета для ўнучкі паедзеце, далібог аштрафую!

...Слова — як адкрыццё, бо... яно ж і ў нас, дзяцей, калі мы, бывала, празмерна свавolілі, бацькі строга пыталіся: «Гэта што за *хімерады*?»

Пыталіся, калі старэйшая сястра, пасля школы сабралася завербавацца на Данбас; калі адзін з братоў памяняў свой стары гармонік на яшчэ старэйшы акардэон; калі другі, схадзіўшы «першы раз у першы клас», назаўтра заявіў, што ў школу болей не пойдзе: маўляў, учора схадзіў — і хопіць з яго!

Усё гэта (і безліч іншага!) — непадзяванага, нечаканага — называлася *хімерадамі*. І, выходзіць, не толькі ў нас?

## Свая рука — не ліхадзейка

...Цягнік адышоў ад станцыі, стаў набіраць хуткасць. Маладая пара (па ўсім відаць — нарачоныя) і старэнькая бабуля размясціліся ў адным з «адсекаў» плацкартнага вагона. Праваднік ужо праверыў у іх білеты, значыць, можна даставаць перакус. У дарозе, ды пад мерны перастук колаў, гэта — ці не першая справа. Хлопец выняў з пакета бутэльку «кока-колы», аднаразовыя кубачкі, дзяўчына дастала беляшы (няйначай — прыдбаныя на вакзале?).

Бабуля ў гэты самы час засцяліла столік чыстай сурвэткай, потым з карзіны выцягнула торбачку-саматканку і ўжо з яе — вараныя яйкі, памідоры, лустачкі хлеба «засланыя» скрылькамі апетытнага сала.

Але і на гэтым яе прыгатаванні не скончыліся: са зрэбнай анучкі выкацілася некалькі пахучых (бо яшчэ цёплых) бульбін «у мундзірах».

Маладая пара, якая паспела ўжо адкусіць ад сваіх куплёных прысмакаў, чамусьці спынілася — стала ўважліва сачыць за суседкай.

— Ну, што, дзеткі, давайце знаёміцца? Я — Сцепаніда, а вы? Аня і Ваня? Добрыя імечкі — цёплыя! І вы малайцы... Відаць, пажаніцца сабраліся? Дык суньцеся бліжэй і хавайце свае гумовыя *капендрыкі*. Давайце майго паямо — бульбачкі, хлеба з сальцам ды з памідоркамі, а потым зап'ем усё малачком-кіслячком. Да яго мы сёння *шмэндрыкі* пяклі. Так што не саромцеся, памажыце старой ачысціць столік. А то дачка напакавала мне нібы на Поўнач, а я ж да царквы ўсяго, да святой іконы — памаліцца за дзяцей сваіх, за ўнукаў... Свечачку паставіць за спачын чалавека свайго, што з вайны не вярнуўся... Калі яшчэ выберуся...

Ваню з Аняй доўга запрашаць не прыйшлося: пахаваўшы свае, відаць, звычныя прысмакі, яны з ахвотай сталі дапамагаць бабулі — «ачышчаць» столік.

Аднак ляжала на ім не ўсё: завяршалі перакус апетытныя хатнія піражкі.

— Гэта — шмэндрыкі, — аб'явіла бабуля.

— А з чым яны? — у адзін голас запыталі маладыя.

— З бульбай, дзеткі, з тоўчанкай, запраўленай смажаным сальцам з цыбулькай ды кропчыкам! Бачыце, якія пульхныя? Бо на малачцэ. Сваё маем — дачка кароўку яшчэ трымае. І шмэндрыкі мы самі пячом. Вы, дзеткі, таксама старайцеся больш самі рабіць. Бо яно ж свая рука — не ліхадзейка.

## Эстафетай

Гэта сям'я жыла на нашай вуліцы, «за пераездам». Гаспадара звалі Змітрам, гаспадыню — адпаведна — Змітрыхай... А яшчэ — вялікай гарапашніцай, бо, апроч цяжкай працы на торфаразгрузцы (была такая на нашай станцыі), жанчыну дома чакала вялікая гаспадарка: каровы, свінні, куры... А яшчэ — мужык, сапраўдны абібок, ды такі ж сынок, што і крошкі пабраў не з маці, а з бацечкі...

Таму на ўсе прапановы спыніцца, пасядзець, пагаварыць, адказ у Змітрыхі быў адзін: «Няма калі». Нават есці, казалі, яна не садзілася — усё лёцьма, усё на хаду.

Але ж нават пры гэтым жанчына не паспявала: работы заставалася шмат, асабліва ў хаце. А калі дадаць, што менавіта там гаспадыня (і часам па некалькі тыдняў) трымала маленькіх цялят (бо ў хляве праз шчыліны вецер каровам вушы адрываў), дык можна сабе ўявіць, які «парадак» быў у пакоях.

Праўда, каб дайсці да іх, трэба было адолець «паласу перашкод» у сенцах, дзе чаго толькі ні было: цэбры — пустыя і поўныя, мяхі з розным дабром, вёдры, кашалі, дзежкі, каробкі, дровы, лучына для распалу ў печы...

Усё гэта на нашай вуліцы называлася адным словам — *загураста*.

— Дачушкі, бежкі прыбярыце ў хаце, — загадвала нам з сястрою матуля, — а то суседзі прыйдуць на вячоркі. Скажуць, дзве дзеўкі-нявесты і ў хату не ўлезці — такая загураста...

Так што слова гэта засела ў нашых галовах з дзяцінства. Яго добра ведаюць мае родныя сястра і браты, а з нашых аповедаў — нашы дзеці і нават дзеці нашых дзяцей.

**Раіса ДЗЕЙКУН,**
*г. Гомель.*

**Ад рэдакцыі.** Без языка і звон нямы... Што ўжо казаць пра чалавека, пра людзей? Мы — гаворым, гутарым, часам балабонім, талкуем, нешта гародзім, мелем, вядзём гамонку, звонім ва ўсе званы, точым лясы... І ўсё гэта — дзякуючы словам: цёплым, родным, розным... У сэнсе — звычным і не зусім...

Спадарыня Дзейкун (дзейкаць, дарэчы, таксама сінонім — да слова гаварыць) узгадала колькі самабытных слоў са свайго маленства-дзяцінства. А іх жа, відаць, багата ў кожнага? Дык чаму б не ўзгадаць, чаму б не падзяліцца? Пішыце, бо:

*Маўчанне*
*Ніколі не было*
*І не будзе золатам:*
*Яно — або ў шмат разоў*
*даражэйшае.*
*Або — нічога не вартае.*
*(Максім Танк)*

■

■ Афіцыйна

# ШКОЛЫ Ў ТУРАВЕ АПТЫМІЗАЦЫЯ НЕ ЗАКРАНЕ

**У нумары за 22 сакавіка «Звязда» змясціла зварот у рэдакцыю бацькоў і вучняў СШ № 1 горада Турава, якія былі заклапочаны далейшым лёсам сваёй навучальнай установы.**

Праблема заключалася ў тым, што Міністэрствам адукацыі было прынята рашэнне аб павелічэнні напаўняльнасці першых, пятых і дзясятых класаў у гарадскіх школах. І раённы аддзел адукацыі, у сваю чаргу, вырашыў вучнямі СШ № 1 даўкамплектаваць летась класы ў СШ № 2.

«Калі сёння мы не захаваем усе класы (з першага па адзінаццаты), то праз некалькі гадоў гэта прывядзе да ліквідацыі школы, — хваляваліся нашы чытачы. — Мы разумеем, што любыя рэформы ў школе павінны праводзіцца на карысць вучняў. Але навошта механічна перакідваць дзяцей са школы ў школу? І хто ўзяў пад увагу хоць бы тую акалічнасць, што дзяцей адрываюць ад любімых настаўнікаў, ад сяброў?»

«Упраўленнем адукацыі сумесна з Жыткавіцкім раённым выканаўчым камітэтам быў разгледжаны зварот па пытанні ўкамплектавання сеткі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі г.Турава на пачатак 2014/2015 навучальнага года, — паведамілі нам у афіцыйным лісце, які прыйшоў **з упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама.** — У адпаведнасці з пратаколам пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 студзеня 2013 года № 36 і планам аптымізацыі ў 2014 годзе сеткі ўстаноў адукацыі, іх штатнай колькасці, выконваемых імі функцый, якія былі зацверджаны міністрам адукацыі Сяргеем Маскевічам і ўзгоднены з намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатолем Тозікам, сярэдняя напаўняльнасць I, II, V, VI, X і XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, размешчаных у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, павінна складаць 24 вучні.

Аднак у сувязі з тым, што населенаму пункту Тураў статус горада быў прысвоены выключна па гістарычных падставах, а фактычна па колькасці насельніцтва ён з'яўляецца сельскім населеным пунктам, пры камплектацыі класаў у школах Турава будзе практыкавацца падыход як да сельскіх устаноў адукацыі.

У 2014/2015 навучальным годзе 1, 5 і 10 класы будуць функцыянаваць у двух школах, і від дзяржаўнай установы адукацыі «сярэдняя школа № 1 г.Турава» не будзе зменены».

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Трастбанк
*«Банк, основанный на доверии»*
**ЗАО «Трастбанк»**
220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 30 228,3 | 28 903,9 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 481,4 | 367,8 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 181 702,9 | 192 663,5 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 69 724,8 | 67 876,7 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | 14 654,9 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 303 709,9 | 332 576,6 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 2 363,6 | 195,6 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 170 948,3 | 116 177,3 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 22 160,7 | 20 959,4 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 49 508,0 | 47 674,1 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 830 827,9 | 822 049,8 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 47 118,0 | 46 528,2 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 74 082,8 | 49 836,9 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 446 347,6 | 467 436,8 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 37 521,5 | 71 768,2 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 12 106,9 | 11 671,7 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 617 176,8 | 647 241,8 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 97 787,3 | 85 416,6 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 20 195,3 | 9 719,8 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 91 188,2 | 74 369,4 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 4 480,3 | 5 302,2 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 213 651,1 | 174 808,0 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 830 827,9 | 822 049,8 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за январь – март 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 15 786,4 | 12 053,1 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 11 512,5 | 12 276,3 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4 273,9 | (223,2) |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 7 583,8 | 11 113,5 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 689,9 | 783,8 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 6 893,9 | 10 329,7 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 37,7 | 8,4 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 12,9 | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 3 617,4 | 1 192,5 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (4,0) | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 2032,7 | (2261,5) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 3 569,7 | 2 512,6 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 15 333,0 | 14 358,3 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 869,7 | 1 177,8 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 166,1 | 545,4 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 18,6 | 68,5 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 147,5 | 476,9 |

**Председатель Правления ЗАО «Трастбанк»** **В.М. Саксон**

**Главный бухгалтер** **Н.В. Бродик**

**Дата подписания «15» апреля 2014 г.**

Финансовая отчетность размещена на сайте
**http://www.trustbank.by/about/financial-statements/quarter/2014/**

УНП 100789114. Лиц. № 14 от 26.04.2013 г. НБ РБ

Страховая организация **ЗАСО «Дельта Страхование»**

Учетный номер плательщика: 100336711
Единица измерения: тыс. руб.
Адрес: г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95-319

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 года

| АКТИВЫ | Код строки | на 1 января 2014 года | на 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 9 534 | 14 706 |
| Нематериальные активы | 120 | – | – |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | – | – |
| в том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | – | – |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | – | – |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | – | – |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | – | – |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 11 732 336 | 11 528 724 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 160 | – | – |
| Отложенные налоговые активы | 170 | 1 974 | – |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | – | – |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **11 743 844** | **11 543 430** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 31 332 | 21 726 |
| в том числе: материалы | 211 | 31 332 | 21 726 |
| незавершенное производство | 212 | – | – |
| прочие запасы | 213 | – | – |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 215 | – | – |
| Расходы будущих периодов | 220 | 3 463 | 4 935 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 230 | – | – |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 240 | 62 071 | 1 047 |
| в том числе: резерв незаработанной премии | 241 | 60 793 | 685 |
| резервы убытков | 242 | 1 278 | 362 |
| другие технические резервы | 243 | – | – |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 603 451 | 104 754 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | – | – |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 15 115 066 | 11 975 146 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | – | – |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **15 815 383** | **12 107 608** |
| **БАЛАНС** | **300** | **27 559 227** | **23 651 038** |
| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | на 1 января 2014 года | на 31 декабря 2012 года |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 4 465 000 | 4 465 000 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | – | – |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | – | – |
| Резервный капитал | 440 | 7 206 924 | 7 002 873 |
| в том числе резервный фонд заработной платы | 441 | – | – |
| Добавочный капитал | 450 | 71 778 | 71 778 |
| в том числе прирост (переоценка) стоимости объектов недвижимости, приобретенных за счет страховых резервов | 451 | – | – |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 3 466 355 | 1 988 805 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | – | – |
| Целевое финансирование | 480 | – | – |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **15 210 057** | **13 528 456** |
| **IV. СТРАХОВЫЕ РЕЗЕРВЫ И ФОНДЫ** | | | |
| Резервы по видам страхования, относящимся к страхованию жизни | 500 | – | – |
| Резерв незаработанной премии | 501 | 277 230 | 59 569 |
| Резервы убытков | 502 | 55 592 | 13 864 |
| Другие технические резервы | 503 | – | – |
| Иные страховые резервы | 504 | – | – |
| Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 505 | 8 836 | 5 842 |
| Гарантийные фонды | 506 | – | – |
| Иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 507 | – | – |
| **ИТОГО по разделу IV** | **509** | **341 658** | **79 275** |
| **V. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | – | – |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | – | – |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 540 | 252 088 | 504 176 |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | – | – |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | – | – |
| **ИТОГО по разделу V** | **590** | **252 088** | **504 176** |
| **VI. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 11 614 321 | 9 500 000 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | – | – |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 141 103 | 39 131 |
| в том числе: страхователям | 631 | – | – |
| страховым агентам и брокерам | 632 | 11 864 | – |
| прочим кредиторам по операциям страхования, сострахования | 633 | 3 197 | – |
| по операциям перестрахования | 634 | 22 574 | – |
| депо премий по рискам, переданным в перестрахование | 635 | – | – |
| поставщикам и подрядчикам | 636 | 608 | – |
| по авансам полученным | 637 | – | – |
| по налогам и сборам | 638 | 58 758 | 3 817 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 639 | 17 454 | 13 459 |
| по оплате труда | 640 | 25 931 | 20 879 |
| по лизинговым платежам | 641 | – | – |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 642 | – | – |
| прочим кредиторам | 643 | 717 | 976 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 650 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 660 | – | – |
| Резервы предстоящих платежей | 670 | – | – |
| Прочие краткосрочные обязательства | 680 | – | – |
| **ИТОГО по разделу VI** | **690** | **11 755 424** | **9 539 131** |
| **БАЛАНС** | **700** | **27 559 227** | **23 651 038** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2013 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2013 года | За январь–декабрь 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ, ОТНОСЯЩЕМУСЯ К СТРАХОВАНИЮ ЖИЗНИ** | | | |
| Страховые взносы (страховые премии), брутто | 010 | – | – |
| Страховые выплаты | 020 | – | – |
| Изменение резервов по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или -) | 030 | – | – |
| Отчисления в гарантийный фонд и фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 040 | – | – |
| Расходы на ведение дела | 050 | – | – |
| Доходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни | 055 | – | – |
| Расходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни | 056 | – | – |
| **Прибыль (убыток) от операций по видам страхования, относящимся к страхованию жизни** (строки 010 - 020 + 030 - 040 - 050 + 055 - 056) | 060 | – | – |
| **ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ ИНОМУ, ЧЕМ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ** | | | |
| Страховые взносы (страховые премии), брутто – всего | 070 | 501 157 | 122 751 |
| в том числе: по прямому страхованию и сострахованию | 071 | 407 705 | 121 828 |
| по рискам, принятым в перестрахование | 072 | 93 452 | 923 |
| Страховые премии по рискам, переданным в перестрахование, брутто | 073 | 41 674 | 9 376 |
| Страховые взносы (страховые премии) с учетом перестрахования, нетто (строки 070 - 073) | 074 | 459 483 | 113 375 |
| Изменение резерва незаработанной премии, брутто | 080 | (217 661) | (58 834) |
| Изменение доли перестраховщиков в резерве незаработанной премии | 081 | 60 108 | 685 |
| Изменение резерва незаработанной премии с учетом перестрахования, нетто (итог строк 080 и 081) | 082 | (157 553) | (58 149) |
| Заработанные премии, нетто (итог строк 074 и 082) | 085 | 301 930 | 55 226 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты), брутто | 090 | 248 328 | 68 807 |
| Доля перестраховщиков в убытках (страховых выплатах) | 091 | 62 741 | 16 670 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) с учетом перестрахования, нетто (строки 090 - 091) | 092 | 185 587 | 52 137 |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат), брутто | 095 | (41 728) | (13 608) |
| Изменение доли перестраховщиков в резервах убытков (страховых выплат) | 096 | 916 | 362 |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат) с у четом перестрахования, нетто (итог строк 095 и 096) | 097 | (40 812) | (13 246) |
| Заработанные премии за вычетом страховых убытков (страховых выплат) (строки 085 - 092 + 097) | 100 | 75 531 | (10 157) |
| Изменение других технических резервов | 110 | – | – |
| Изменение иных страховых резервов | 120 | – | – |
| Отчисления в фонды предупредительных мероприятий и гарантийные фонды | 130 | 2 994 | 1 218 |
| Отчисления в иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 140 | – | – |
| Расходы на ведение дела, всего | 150 | 316 531 | 160 511 |
| в том числе: комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 151 | 6 913 | 185 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 155 | 3 548 | 1 406 |
| Доходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни | 160 | 3 797 | 1 399 |
| Расходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни | 165 | – | – |
| **Прибыль (убыток) от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни** (строки 100 + 110 + 120 - 130 - 140 - 150 + 155 + 160 - 165) | 170 | (236 649) | (169 081) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 180 | 3 908 591 | 2 129 544 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 181 | – | – |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 182 | – | – |
| проценты к получению | 183 | 2 211 664 | 229 104 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 184 | 1 696 927 | 1 900 440 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 190 | 930 | 18 |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 191 | – | – |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 192 | 930 | 18 |
| Доходы по финансовой деятельности | 200 | 473 295 | 458 201 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 201 | 473 295 | 93 733 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 202 | – | 364 468 |
| Расходы по финансовой деятельности | 210 | 2 027 957 | 367 009 |
| в том числе: проценты к уплате | 211 | 2 027 957 | – |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 212 | – | 107 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 213 | – | 366 902 |
| Иные доходы | 220 | – | – |
| Иные расходы | 225 | 528 138 | 511 662 |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности** (строки 180 - 190 + 200 - 210 + 220 - 225) | 230 | 1 824 861 | 1 709 056 |
| **Прибыль (убыток) отчетного периода** (строки ± 060 ± 170 ± 230) | 240 | 1 588 212 | 1 539 975 |
| Налог на прибыль | 250 | 77 636 | 27 154 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 260 | 1 974 | – |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 270 | – | – |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 280 | 35 000 | 4 |
| Отчисления во внебюджетный централизованный инвестиционный фонд в соответствии с указом Президента РБ от 07.08.2012 №357 | 281 | – | – |
| **Чистая прибыль (убыток)** (строки ± 240 - 250 ± 260 ± 270 - 280 - 281) | 290 | 1 477 550 | 1 512 817 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 300 | – | – |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 310 | – | – |
| **Совокупная прибыль (убыток)** (строки ± 290 ± 300 ± 310) | 320 | 1 477 550 | 1 512 817 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 330 | – | – |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 340 | – | – |

**Руководитель** **Телипко Валерий Васильевич**

**Главный бухгалтер** **Кириенко Алла Петровна**

Достоверность баланса и отчета о прибылях и убытках ЗАСО «Дельта Страхование» подтверждена аудиторским предприятием: ЗАО «Аудитория». Свидетельство о государственной регистрации Мингорисполкома Минский горисполком решением от 27 июля 2006 г. № 1493 зарегистрировал в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190480971, дата выдачи свидетельства 31 июля 2006 г.

■ «Avant-gARTe. Ад квадрата да аб'екта»



# ГУЛЬНЯ Ў ПАЗЛЫ

## Частка 1. ІНТЭРАКТЫЎНАЯ

**Стракатыя каляровыя кавалачкі на белай плоскасці — адна з інсталяцый на вялікай выставе беларускага сучаснага мастацтва, што працуе ў павільёне на праспекце Пераможцаў у Мінску. Калі праходзіш міма, то вочы чапляюцца за стракатасць, правакуючы на тое, каб стаць і скласці гэты пазл у адзіную карціну. З вялікай экспазіцыяй дакладна гэтак жа: тут усяго шмат, але трэба папрацаваць і розумам, і ўяўленнем кожнаму гледачу, каб скласці пазл пад назвай «сучаснае мастацтва сённяшняй Беларусі». Выстава, складзеная з імёнаў, твораў ці асобных мастацкіх праектаў, тым не менш з'яўляецца адлюстраваннем самой краіны (ці не яе вобраз, асаблівасці жыцця і характару людзей паказваюць мастакі?), яе творчага патэнцыялу (пра які найперш сведчаць прадстаўнікі таго самага перадавога мастацтва, якое ідзе ў авангардзе ідэй і думак, а значыць, і грамадства). Таму гэтая выстава — больш, чым магчымасць цікава правесці час, нягледзячы на тое, што свой пазл тут будзе складваць у думках кожны. Але ў тым, каб ён склаўся, бачылі сваю мэту арганізатары. Дзеля таго падчас ажыццяўлення такога вялікага праекта вырашалі наступныя задачы.**

### ЗАДАЧА ПРАСТОРАВАЯ

**Міхаіл ШЫКАЎ, архітэктар павільёна (быў архітэктарам беларускага павільёна на Венецыянскай біенале):**

— Прастора для мяне — філасофскае пытанне. Таму да вырашэння прасторы я імкнуўся падыходзіць па-філасофску, тут інакш нельга. Яшчэ і таму, што ў гэтай прасторы сабраны розныя персаналіі. Трэба па магчымасці кожнага задаволіць (у гэтым плане мастацтва ад жыцця нічым не адрозніваецца). Трэба шмат працаваць і пры гэтым не парушаць запаветы: не крыўдзіць і задавольваць людзей. Гэта наогул адна з задач мастацтва, у тым ліку і сучаснага. Таму асваенне прасторы — важны момант. Для сучаснага мастацтва ён больш адчувальны, чым для традыцыйнага, якое наша беларуская публіка прывыкла ўспрымаць.

***— У гэтым жа павільёне праходзіла Першая беларуская трыенале сучаснага мастацтва. Ці ўлічылі вопыт, вынесены пасля арганізацыі таго праекта?***

**М. Шыкаў:**

— Гэтая прастора, калі гаварыць пра вонкавую абалонку, не прадугледжана для выстаў, яна абсалютна агрэсіўная. І гэта галоўная праблема, з якой не справілася папярэдняя выстава. Яна не справілася з агрэсіяй самога памяшкання. Таму я як аўтар павінен стварыць нейкі асяродак, каб яно не ціснула. На выставе павінна быць шмат святла. Вартасць гэтай прасторы — вялікая колькасць святла, што трэба скарыстоўваць. Гэта, на мой погляд, быў адзіны недахоп мінулай выставы, усё астатняе можна лічыць вартасцю.

**Аляксандр ЗІМЕНКА, старшыня ІКОМ (Міжнароднага савета музейнай дзейнасці) Беларусі, член куратарскай групы:**

— Ёсць асаблівасць, якая прынцыпова адрознівае гэты праект. Калі мы пачыналі працу, то думалі найперш пра тое, як размяркоўваць выставачную прастору. Тут жа прадстаўлены не толькі мастакі. І мы адышлі ад прынцыпу рэгіянальнага падзелу, каб усе вобласці былі прадстаўлены, ды размеркавання па жанрах. Вы бачыце некалькі гатовых праектаў, такіх, як праект «$H_2O$», праект «Тэхнаарт», «Пастулат». Па сутнасці, гэта «выставы ў выставе», таму было важна не змяшаць іх так, каб атрымалася адно цэлае. Таму ўявіць сабе іншы падзел прасторы вельмі складана. Глядач, які прыходзіць сюды, мае магчымасць самастойна выбіраць, што ён паглядзіць. У адрозненне ад музейнай практыкі, мы не робім адзін экспазіцыйны рад, які можна прайсці ад першага экспаната да апошняга. Гэта таксама асаблівасць сучаснага мастацтва. Трэба разумець: гэта не выстава дасягненняў народнай гаспадаркі. Мы даём магчымасць чалавеку паглядзець, выбраць, адзначыць. Асобна хочацца сказаць, што мы вельмі зацікаўленыя ў тым, каб гледачы актыўна каментавалі, фатаграфавалі, выказваліся пра тое, што ўбачылі. Можна пра многае спрачацца: пра выбар аўтараў, канкрэтных прац. Але самае галоўнае, каб гэта выклікала эмоцыі, выклікала водгукі гледачоў.



**Леанід ХОБАТАЎ, намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў:**

— У нас ёсць ідэолаг, які задаў сітуацыю, параметры ў гэтай прасторы. Умовы, якія сфармуляваныя, задавальняюць мяне і іншых мастакоў. Сектары, нішы, асобная прастора, на якую мае права мастак, — можна сказаць, што створана нават выключная сітуацыя. Пра гэта часта мастакі мараць, для таго, каб адасобіць свае працы, вырашыць сваю прастору. Тым больш што ёсць рэчы, якія патрабуюць выключнасці ў пытаннях прасторы. Такіх аб'ектаў у нас ёсць столькі, каб гэтую задачу вырашыць. Выстава прафесійна складаная, прадугледжвае вырашэнне псіхалагічнай задачы для гледача. Глядач, не бачыўшы ўсяго адразу, мае шанц паступова спасцігаць усю складанасць, «кухню» і змест сучаснага мастацтва. Таму што калі на яго наваліцца інфармацыя адразу, то гэта цяжка — нават прафесіянал не вытрымае такога аб'ёму. Таму што тут вельмі шырокая палітра — і ў сэнсе формы, і ў сэнсе колеру і іншых складнікаў. Гэта шматабяцальны, амбіцыйны праект. Для нас важная тэма — «адбыцца» не толькі эмацыянальна, але яшчэ і фармальна. Таму што гэта патрабаванні прафесійныя і мы абавязаны іх вырашыць. Далей — эмацыянальны бок, за які адказвае кожны мастак персанальна. Ён адказвае за сябе, нясе інфармацыю, напаўняе і дапаўняе прастору. Такім чынам ідзе дыялог паміж гледачом і мастаком. Мастакоў цэлае войска — больш за 1000 чалавек. Нават з імі пазнаёміцца для публікі — цудоўная нагода праз такі праект. Тым больш, што фармат, які зададзены, у нас пакуль рэдкі, але, можа быць, набудзе пастаянны характар. Беларусь даўно пакутуе ад малых прастораў (у выставачных праектах). Нам не хапае прасторы, нам, урэшце, не хапае мастацтва.

**Міхаіл ЦЫБУЛЬСКІ, куратар віцебскіх праектаў «Матэрыя мастацтва: цвёрдае і мяккае» і «Палёт»:**

— Калі ўсё арганізавана з разуменнем, то пажаданні мастакоў заўсёды ўлічваюцца. У любым праекце, які стварае куратар, ён арыентуецца на тое, што робяць мастакі, і, адпаведна, адбірае творы. Але на нейкім этапе ідэя праекта становіцца дамінуючай. Жаданні мастакоў павінны ўпісвацца ў канцэпцыю, прастору экспазіцыі, якая зададзена яе кантэкстам. Атрымліваецца так, што ўсе пажаданні мастакоў, па магчымасці, улічваюцца, калі яны не разбураюць агульнага стану праекта. Нам гэта можа быць больш, чым іншым, зразумела. Мы адзіны рэгіянальны праект, які знайшоў сабе асобную прастору ў вялікай прасторы. У праекце «Матэрыя мастацтва: цвёрдае і мяккае» аб'екты і тэкстыль прадстаўлены як дзве іпастасі матэрыі. Як вядома, тэкстыль Беларусі можна падзяліць умоўна на 2 школы: мінскую, якая звязаная з дзейнасцю Акадэміі мастацтваў, і віцебскую (якую ўвасабляюць выпускнікі кафедры дызайну Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта). У гэтым праекце ўдзельнічалі яркія прадстаўнікі апошняй школы, дзе жыве дух эксперыментатарства. Другі наш праект «Палёт», ад вядомага мастака Аляксандра Салаўёва, уключае серыю яго прац і мультымедыйную прэзентацыю-маналог мастака пра творчасць, сучаснасць. Гэта спроба ахапіць неабсяжнае, сказаць, што ёсць мастацтва сёння. Толькі ад імя ўсіх нас гаворыць мэтр і вядомы беларускі авангардыст. І хацелася б сказаць аб экспазіцыйнай рабоце, якая ўскладзена на Васіля Васільева, як вопытнага майстра ў гэтай працы. Але мне б хацелася гаварыць пра тое, што сучасныя мастакі павінны напрацоўваць нешта новае, сыходзіць у нейкія іншыя сусветы, адкрываючы іх іншым.



### ЗАДАЧА ПРЭЗЕНТАЦЫЙНАЯ

***— Адна справа — рабіць выставу для айчыннай публікі. Але ж маецца на ўвазе, што на гэтую выставу завітае замежны глядач, які прыедзе на чэмпіянат свету па хакеі. Ці імкнуліся арганізатары ўявіць яго мастацкія густы?***

**А. Зіменка:**

— Што тычыцца таго, хто да нас прыедзе. Былі даследаванні ў музейнай сферы наконт наведвання нашых музеяў. Высветлілася, што больш па музеях нашы суайчыннікі ходзяць за мяжой. Таму што гэта абавязковая частка наведвання краіны. Калі ёсць усяго некалькі дзён для знаёмства з ёй, то музей прадстаўляе канцэнтраваную форму ведаў. Наша выстава выконвае тую ж функцыю. Няважна, прыедуць да нас захопленыя пасіянарыі, хакейныя фанаты ці людзі, якія вырашылі скарыстацца магчымасцю пазнаёміцца з Беларуссю, мы ім прапаноўваем магчымасці правесці вольны час. Мне здаецца, што гэтая выстава зможа зацікавіць і тых, хто проста прыедзе «хварэць» за зборную. Акрамя таго, некаторыя купляюць квіткі загадзя і нават калі іх зборная не выходзіць у наступную стадыю чэмпіянату, застаюцца тут. Гэта будзе годны спосаб правесці час у Мінску.

Але нельга сказаць, што гэтая экспазіцыя рабілася выключна для замежных турыстаў ці разлічана на нацыянальнага гледача. Усім будзе цікава: і спецыялістам, і шырокай аўдыторыі. Акрамя мастацтва, што прадстаўлена ў павільёне, на працягу двух месяцаў тут будзе праводзіцца вялікая колькасць мерапрыемстваў, якія дазволяць казаць, што гэта не проста выстава, а праект. Гэта зроблена для таго, каб мы маглі прааналізаваць, што было, што ёсць і што будзе.

**Нам важна было, каб найперш сюды зазірнуў беларускі глядач. Мы гэтую выставу стваралі больш для сябе, каб прааналізаваць, што ў нас ёсць.**

**Наталля ШАРАНГОВІЧ, дырэктар Музея сучаснага выяўленчага мастацтва:**

— Мы не рабілі сацыялагічнага апытання: якая будзе публіка, што прыедзе да нас з-за мяжы. Але мы цудоўна ведаем пра тое, што сучаснае мастацтва для замежнай публікі — гэта такая з'ява, якая заўсёды цікавіць. А ў тым, што замежнаму гледачу будзе цікава, я не сумняваюся. Таму што гэта агульнаеўрапейская тэндэнцыя: сёння вялікая колькасць выстаў, біенале добра наведваюцца. Выбар гэтай залы быў абумоўлены не толькі тым, што яна самая вялікая ў Мінску. Тут побач «Мінск-Арэна», дзе будуць праходзіць матчы ЧС па хакеі. Разлік на тое, што блізкасць дасць магчымасць таму самаму замежнаму гледачу дайсці сюды. Таму што будзе добрая вонкавая рэклама, мы хацелі б, каб гэтае месца было расквечана рознымі колерамі: чорным, белым, чырвоным. Гэта будзе добра заўважана здалёк. А другая частка нашых высілкаў была скіравана на тое, каб ужо калі чалавек прыйшоў сюды, яму было цікава.

Разлік быў, што прыцягне сама з'ява, што ў нас ёсць сучаснае мастацтва, што ў нас ёсць мастакі, якія працуюць у розных кірунках. У нас удзельнічаюць дызайнеры, фатографы, жывапісцы, графікі, творцы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У нас прадстаўлены арт-аб'екты, прычым трэба звярнуць увагу, што некаторыя з іх павінны стаць дамінантамі. Адна з дамінантаў — аб'ект Васіля Васільева. Гэта вежа 8-метровай вышыні. Другі арт-аб'ект Канстанціна Вашчанкі — вялікі чорны куб, які выйшаў з квадрата. Мы зыходзілі з таго, што, не разлічваючы на асаблівую ўвагу спецыялізаванай замежнай публікі (усё ж гэта не з'ява культурнага турызму), так ці інакш гэты глядач сюды зазірне. Але нам важна было, каб найперш сюды зазірнуў беларускі глядач. Мы гэтую выставу стваралі больш для сябе, па-першае, каб прааналізаваць, што ў нас ёсць. Што было створана і што ствараецца цяпер. Звярніце ўвагу: выстава складаецца з некалькіх частак. Нездарма з'явілася адна з частак у Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, якая звязана з гісторыяй беларускага авангарда. Спроба прааналізаваць, што сучаснае мастацтва не ўзнікла на пустым месцы, што гэтыя мастакі, якія эксперыментуюць сёння, не з'явіліся ніадкуль. У нас усё XX стагоддзе, уся яго гісторыя гаворыць, што ў нас былі авангардысты, нонканфармісты, нефармальныя плыні. Людзі працавалі, у іх было творчае крэатыўнае мысленне. І іх мысленне вельмі паўплывала на мастакоў XXI стагоддзя. Нам хацелася даказаць самім сабе, што ў нас ёсць гісторыя сучаснага мастацтва і сённяшні дзень гэтага мастацтва. А нам ёсць што прэзентаваць насамрэч. Чамусьці за мяжой адкрываюцца выставы нашых мастакоў — у галерэях персанальныя, агульныя выставы, групавыя, міжнародныя. І паўсюдна ідуць вельмі добрыя водгукі пра нашых мастакоў. Урэшце мы самі павінны сказаць сабе: у нас цудоўнае мастацтва, давайце будзем яго паказваць годна і глядзець.

**Л. Хобатаў:**

— У нас ёсць геніі! Адзінае, чаго нам не хапае, — абвясціць гэта ўсяму свету. Назва выставы мае пад сабой інтрыгу. Ёсць пра што разважаць. Мне здаецца, што адбываецца працэс інтэграцыі жывапісу ў прадмет. Сінтэз, пра які гавораць на працягу 100 гадоў. Насамрэч гады ідуць на тое, каб вызначыцца, што адбываецца ў мастацтве. Падстаў будзе дастаткова, каб зрабіць высновы: што ёсць сучасны жывапіс, куды ён ідзе і чаму сучаснае мастацтва адказвае на пытанні актуальнага мастацтва, але пры гэтым завязана на традыцыі. У нас ёсць традыцыі, мы ад іх не адмовіліся, але арганічна вырастаем яшчэ ў адну, ці наогул у новую форму. Так і паўстаюць сучасныя тэндэнцыі, на якія мы арыентаваны і працягваем працаваць у сусветным кантэксце.

**Запісала Ларыса ЦІМОШЫК.**

■ «100 гадоў беларускага авангарда»

# ЛЮДЗІ XX

## Частка 2. ГАНАРОВАЯ



...Жывыя чалавечыя скульптуры прыцягвалі ўвагу, але і дысаніравалі з ахоўнікамі ў касцюмах колеру хакі, якія стаялі на ўваходзе ў Музей сучаснага выяўленчага мастацтва. Туды-сюды снаўдалі мімы з белаcнежнымі тварамі, танцавальны калектыў паказваў клас у сучасным адрывістым танцы, на другім паверсе іграла жывая інструментальная музыка. Але галоўным у гэты час было імкненне бліжэй падысці да палотнаў і разглядзець на іх тлустыя мазкі.

Другая частка праекта «Avant-gARTe. Ад квадрата да аб'екта», прадстаўленая ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, паказвае гледачу першакрыніцу, першаасноў цяперашніх пошукаў у беларускай выяўленчай культуры. Выстава прадстаўляе наведвальніку цэлае стагоддзе, увасобленае ў вобразах мастакоў. У экспазіцыі сабраны не проста палотны, але знакавыя імёны, творчыя аб'яднанні, тэндэнцыі і плыні беларускага авангарда XX стагоддзя.

Калі заходзіш у музей, разбягаюцца вочы, бо адзін твор прыцягвае ўвагу спалучэннем колераў, другі — мудрагелістай формай, трэці — і тым, і другім. У музеі знойдзецца шмат цікавінак накшталт інсталяцый Вольгі Сазыкінай, створаных аўтаркай спецыяльна для выставы. Яна ж, якая выйшла з творчага асяроддзя беларускага авангарда канца XX стагоддзя, так характарызуе працы сваіх калег-мастакоў: «Тут прысутнічае вельмі шмат інтымнага». Пасля чаго наведвальнікам застаецца гэтае інтымнае разглядаць.



Каб глыбей акунуцца ў час авангарда 1980-х, мы бачым відэапрэзентацыю з захаваных здымкаў перформансу Ігара Кашкурэвіча і Людмілы Русавай «Спаленне Казіміра» і «Уваскрашэнне Казіміра», некалі ажыццёўленага ў Віцебску.

Назва выставы «Сто гадоў беларускага авангарда» мае дваісты сэнс. Па-першае, год таму наша перадавое мастацтва адзначыла ўмоўнае стагоддзе: у 1913 годзе Казімір Малевіч напісаў свой першы «Чорны квадрат» (як задума супрэматызму). Па-другое, выстава ахоплівае ўвесь гэты перыяд развіцця нетрадыцыйнага мастацтва ў Беларусі, пачынаючы з 1910-х гадоў. Самымі старэйшымі выстаўленымі працамі з'яўляюцца палотны Роберта Геніна «Каля вадаёма» ды «Колка дроў», датаваныя 1912 годам, самай маладой — скульптура Уладзіміра Лапо «Tvar» 2012-га.

Праект гучна заяўляе: «Беларускае мастацтва XX стагоддзя, ды і мастацтва краіны наогул, магутнае і значнае».

Магчыма, выстава каштоўная не столькі ў якасці нагляднага інструмента для гасцей краіны, колькі ў якасці значнай культурнай падзеі для саміх беларусаў.

Авангард у мастацтве, калі спрошчана, — гэта рэакцыя на «сацыялку», знешні свет і зводкі навін; гэта ўражанне, спосаб зразумець, усвядоміць, вызначыць сваё месца ў знешнім, глабальным. Пануе не агульнае — індывідуальнае. Асобу дваццатага стагоддзя, якая засталася ў нашай генетычнай ці простай памяці, сёння можна знайсці і вызначыць, зразумець як блізкую ў часавым і геаграфічным планах. Экспазіцыя для гэтага складзена найбольш поўна. Стваральнікі выставы шукалі працы не толькі ў запасніках музеяў (Нацыянальнага мастацкага музея і Музея сучаснага выяўленчага мастацтва), а таксама ў прыватных калекцыянераў, у сваякоў і сяброў жаданых аўтараў, у саміх мастакоў. Выстава сістэматызавала стагоддзе беларускага мастацтва.

Словам, залы музея ва ўладзе авангардыстаў. Пачынаць прагляд варта з класічнага

**Выстава каштоўная не столькі ў якасці нагляднага інструмента для гасцей краіны, колькі ў якасці значнай культурнай падзеі для саміх беларусаў.**

авангарда 1910-20-х гадоў — Віцебскай школы і мастакоў Парыжскай школы — гэта Марк Шагал, прадстаўляць якога няма патрэбы, французскі жывапісец Фернан Лежэ, Роберт Генін, Аляксандр Ахола-Вало.

Працягваецца гісторыя значна пазней, пераважна ў 1960-70-я гады, у перыяд, калі мастацтва рэзка вырываецца з рамак і супрацьпастаўляе сябе сацрэалізму, які панаваў да гэтага. З'яўляюцца новыя мастакі, якія імкнуцца адысці ад афіцыйнай мовы: фармаліст Ізраіль Басаў, сюррэаліст Георгій Скрыпнічэнка, супрэматыстка Надзея Хадасевіч-Лежэ (жонка Фернана Лежэ), Рычард Май, Яфім Раяк.

Самым насычаным будзе знаёмства з мастацтвам 1980-90-х. Магутныя, усюдыісныя перамены ў грамадстве, свядомасці часоў перабудовы прывялі да росквіту беларускага авангарда. Гэта «залаты перыяд» перадавога мастацтва ў нашай краіне.

На выставе прадстаўлены нефармальныя аб'яднанні гэтага часу: «КВАДРАТ» з яго лідарам Аляксандрам Малеем; Асацыяцыя творчай інтэлігенцыі «Форма»; «Няміга-17», вядомая імёнамі Сяргея Кірушчанкі, Леаніда Хобатава, Анатоля Кузняцова; «БЛО», «4-63», «Галіна», «Плюраліс», «Комі-кон» ды іншыя аб'яднанні. Пералічыць усіх удзельнікаў экспазіцыі не ўяўляецца магчымым, лепш іх убачыць.

Новыя формы самавыяўлення 1980-х гадоў таксама знайшлі сваё месца ў экспазіцыі: той жа славуты перформанс Ігара Кашкурэвіча і Людмілы Русавай прадстаўлены ў якасці відэапрэзентацыі з захаваных фотаздымкаў. Мастачка Вольга Сазыкіна свае інсталяцыі «Адзінка персанальнага вымярэння» і «Дыялог, або Абрус з кветак» насамрэч паўтарыла, бо ўпершыню яна стварыла іх у 1997 годзе.

Дзякуючы таму, што ў 1980-90-я гады ў Беларусі з'явіліся калекцыянеры, канец стагоддзя прадстаўлены ў музеі найбольш поўна. Тыя ж Андрэй Плясанаў, Артур Клінаў у гэты час пачалі збіраць працы беларускіх творцаў і на сённяшняй выставе паказалі шмат цікавага. У музеі выстаўлены мастакі, працы якіх цяжка знайсці: напрыклад, спадчына Аляксея Жданава ёсць толькі ў сям'і ды ў прыватных калекцыях.

Некаторыя выстаўленыя аўтары, магчыма, невядомыя або малазнаёмыя наведвальніку музея. Многія з мастакоў выстаўляюцца вельмі рэдка або выстаўляліся даўно і ў невялікіх маштабах. Экспазіцыя — унікальны шанц убачыць закрытае ў сховішчах калекцыянераў ды музеяў мастацтва на свае вочы. Убачыць не проста «сход» палотнаў, а трансфармацыю нефармальнага мастацтва нашай краіны.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ «Мастак і горад. BelART.by»

# ТВОРЫ — НА ВУЛІЦЫ!

## Частка 3. ДЭМАКРАТЫЧНАЯ

На вуліцы можна маляваць!.. Можна на вачах цікаўных ствараць карціну — на стэндзе, сярод тых твораў, якія цяпер захоўваюцца ў музеі, але іх можна бачыць проста на вуліцы (натуральна, што не арыгіналы — бо каштоўнасці ж, за гэтым усё ж прыйдзецца схадзіць у музей). Але тут жа побач са стэндамі вядомых аўтараў — маладыя людзі з фарбамі, якія не проста ўносяць жывінку сваёй працай на людзях, яны імкнуцца ўпісаць свае імёны ў лік прызнаных майстроў. І хто сказаў, што нельга ці не магчыма? Трэба! І гэта частка гарадскога жыцця.

Напрыклад, малады мастак Марат Міхайлаў, які пакінуў свой свежы след на выставачным стэндзе на плошчы Якуба Коласа, сваю карціну патлумачыў так: «Гэта праца пра мой пазітыўны погляд у будучыню горада Мінска, які стварае кожны з нас з дня ў дзень».

Яўген Ковек з Ліды ўбачыў «Мінск у кубе»: у такім горадзе ён захацеў нагадаць пра прыгажосць некранутай прыроды. З адкрытага акна панэльнага шматпавярховіка нібыта паглядзеў на сталіцу PREDOK з Віцебска. Колькі будзе гасцей, для кожнага Мінск адлюструецца ў нейкім асаблівым вобразе. Насамрэч, цікавы той горад, які вобразы нараджае. Але ёсць людзі, якія іх не проста носяць у сабе, а адлюстроўваюць у творах. Чым больш вобразаў для адлюстравання, тым больш складанымі і, адпаведна, цікавымі паўстаюць творы. Ну паглядзіце ж!

Ад «Нараджэння ідэі» Мікалая Бушчыка крочым міма стэндаў і разумеем, як рэчаіснасць у творах напаўняецца такімі пазнавальнымі (нашымі!) сімваламі (як у творы «Крыж пры дарозе» Уладзіміра Клімушкі), нараджае ілюзіі («Бурштынавы шлях» Аляксандра Сільвановіча) ці наогул ператвараецца ледзь не ў казку (падобна на «Дрэвы-цені» Таццяны Радзівілкі). І ўсё гэта тут, на адной пляцоўцы, у адным горадзе.







Фотаздымкі Любові БЯЛЯЕВАЙ.

У гэтай выставе можна пабачыць творы мастакоў, якія былі адзначаны прэстыжнымі міжнароднымі ўзнагародамі. Гродзенскі мастак Юрый Якавенка адзначаны першай прэміяй II Міжнароднай біенале графікі «Josep de Ribera» (Іспанія). Таццяна Кандрацёнка атрымала спецыяльны прыз групы свабоднай эксперыментальнай керамікі школы Р. Раньеры (Італія) на III-м Міжнародным тэатральна-мастацкім фестывалі Zdarzenia (Польшча), Ганна Сілівончык была ўзнагароджана медалём «Талент і прызванне» Міжнароднага альянсу «Міратворац» у Маскве...

Насамрэч праекту «Мастак і горад» ужо тры гады. Першы раз ён быў прысвечаны Марку Шагалу, другі — Казіміру Малевічу. Але сёлета задача вельмі амбітная: паказаць сучасных беларускіх творцаў — графікаў, жывапісцаў. Іх творы захоўваюцца ў калекцыі Музея сучаснага выяўленчага мастацтва, але не значыць жа, што яны павінны быць у сховішчах. Яны створаныя для людзей — і да іх прыходзяць. Сёння — праз стэнды на плошчы. А заўтра самі людзі, упадабаўшы адзін твор нейкага аўтара, захочуць паглядзець на іншыя — і прыйдуць у музей.

Першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Карачэўскі адзначыў:

— Тут прадстаўлены працы сучасных беларускіх мастакоў. Што адметна, што гэты праект могуць пабачыць не толькі аматары мастацтва, якія завітаюць у музей, але і людзі, якія праходзяць міма, і такім чынам далучаюцца да беларускага мастацтва. Гэта магчымасць даведвацца пра яго глыбей і ганарыцца ім. А ў Год гасціннасці гэты праект атрымлівае і дадатковае значэнне.

Арганізатарамі праекта «Мастак і горад» з'яўляюцца Музей сучаснага выяўленчага мастацтва і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, сёлета акцыю падтрымаў Банк ВТБ.

Намеснік старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Ігар Карпенка ўдакладніў задачу гэтай і іншых акцый, якія сёлета будуць адбывацца на вуліцах Мінска:

— Можна сказаць, што ў горадзе з'явілася прыкмета: калі мы сабраліся на плошчы Якуба Коласа, адкрываем чарговы праект «Мастак і горад», — значыць, наступіў вясенне-летні турыстычны сезон. Мы вельмі рады гасцям, якія прыязджаюць у нашу сталіцу ў тым ліку і дзеля таго, каб далучыцца да прыгожага, да культурных адметнасцяў, якія ёсць у нашым горадзе. Гэта не адзінкавы праект дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў горадзе. У бліжэйшы час адкрыецца яшчэ некалькі праектаў, накіраваных на папулярызацыю розных відаў мастацтва. 1 мая адкрываецца сезон фантанаў. 3 мая ля гарадской ратушы пачне працаваць музычны балкон (кожную суботу). Стаў папулярным арт-праект Zabor, сёлета ў ім прадставім працы сучасных беларускіх фотамастакоў. З 10 мая плануем джазавыя суботы, якія будуць праходзіць на пляцоўцы ля Палаца спорту ў зоне гасціннасці. Сёння і горад, і нашы партнёры, якія выйшлі з цікавымі ініцыятывамі, падрыхтаваліся да таго, каб як мага лепш прыняць гасцей сталіцы. Здаецца, вясна пачынаецца нядрэнна: мастацтва на вуліцы выйшла.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

СЕ СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№4
26 апреля 2014 года

Для читателей Беларуси, Казахстана, России

# Евразийский союз: без компромиссов не обойтись

**29 апреля в Минске должен состояться Высший Евразийский экономический совет. Встреча президентов Беларуси, Казахстана и России — это не только заседание высшего наднационального органа Таможенного союза и Единого экономического пространства. Александр Лукашенко, Нурсултан Назарбаев и Владимир Путин должны, по сути, сверить готовность проекта договора о создании Евразийского экономического союза и подписать его.**

Предварительные итоги подготовки самого документа и комплекса сопутствующих экономических и административных вопросов обсуждались 15 апреля в Москве на трехсторонней встрече премьер-министров стран Таможенного союза. Основной принцип договора, как известно, это общий рынок без изъятий и ограничений. По словам главы белорусского правительства, премьер-министры трех стран договорились о том, что договор о создании ЕАЭС и приложения к этому документу должны содержать нормы прямого действия, иметь меньше отсылок и норм, которые в случае возникновения споров можно истолковать двояко.

По мнению белорусской стороны, и именно эту позицию отстаивал на переговорах с коллегами Михаил Мясникович, понятными правилами игры в будущем Евразийском экономическом союзе должны стать равные экономические условия и равные условия конкуренции. Но если белорусская сторона однозначно за то, чтобы 1 января 2015 года пространство ТС стало общим рынком в прямом смысле этого слова, то для России и Казахстана это не столь очевидно. Во всяком случае, в ближайшей перспективе. Речь об экспортных пошлинах на нефть, а здесь подходы экспортеров и покупателей лежат в разных плоскостях.

**Интеграционные инициативы на уровне межрегиональных связей менее политизированы, позволяют партнерам на своем уровне контактировать напрямую, без посредников.**

Подводя итоги московской встречи, казахстанский премьер Карим Масимов не смог избежать определения «взаимные компромиссы». Без которых, как полагает он, государствам — участникам ТС не обойтись — чтобы предприятиям и гражданам трех стран было очевидно: создание Евразийского экономического союза отвечает их интересам.

Таможенный союз сегодня демонстрирует не только интеграционное движение по вертикали, но и встречные инициативы, направленные на сближение. Важный тезис в связи с этим сформулировал заместитель председателя Совета Федерации РФ Ильяс Умаханов во время международного форума «Евразийская экономическая перспектива», который состоялся в Санкт-Петербургском государственном экономическом университете. Он заявил, что тема евразийской интеграции «давно вышла за рамки интереса узких специалистов, став ключевой для геополитики, и находится в фокусе общественного внимания».

Действительно, интеграционные инициативы на уровне межрегиональных связей менее политизированы, позволяют партнерам на своем уровне контактировать напрямую, без посредников. Одна из таких идей — проведение форумов межрегионального сотрудничества. Недавно состоялось несколько рабочих встреч, посвященных регионам России и Казахстана. Сейчас полным ходом идет подготовка к проведению первого Форума регионов Беларуси и России в Минске, который состоится 5–6 июня. На осень запланировано проведение IV Межпарламентского форума «Россия — Таджикистан: потенциал межрегионального сотрудничества».

Евразийские интеграционные процессы уже принесли конкретные результаты: уменьшились торговые барьеры, сближаются тарифные требования и технические регламенты. Конкуренция юрисдикций и «четыре свободы» в ТС уже не отдаленная перспектива, они становятся реальными интеграционными преимуществами для стран-участниц и потенциальных партнеров Евразийского союза. К слову, по итогам прошлого года общий товарооборот в рамках Единого экономического пространства составил 64 млрд долларов.

**Лариса РАКОВСКАЯ.**



Фото БЕЛТА.

15 апреля в Москве прошло заседание Высшего Евразийского экономического совета в составе Глав правительств Беларуси, Казахстана и России. Встреча была посвящена подготовке к подписанию Договора о создании Евразийского экономического союза.

# Интеграция с общественной поддержкой

## И роль в ней средств массовой информации

**Беларусь, Казахстан и Россия активно продвигают проект евразийской интеграции. Страны вплотную подошли к подписанию договора о создании Евразийского экономического союза. Но значит ли это, что союз будет только экономическим? Есть ли или могут ли быть другие измерения интеграции? Дискуссию об этом мы решили начать с интервью министра информации Республики Беларусь Олега Пролесковского.**

**— Уважаемый Олег Витольдович, имеет ли евразийская интеграция информационное измерение? В чем оно состоит? Как может развиваться сотрудничество медиа трех стран?**

— Лидеры наших трех стран неоднократно заявляли единую позицию по вопросу об общественной поддержке процесса евразийской интеграции. Если этот процесс будет двигаться только верхами, без живого интереса и обсуждения «внизу», на уровне простых граждан, бизнеса, общественности тех судьбоносных решений, которые принимаются интеграционными структурами, то Евразийский экономический союз может оказаться мертворожденным образованием. Допустить этого, конечно, нельзя ни в коем случае. А поскольку в работе с общественным мнением ключевую роль играют средства массовой информации, то это, на мой взгляд, и определяет роль СМИ в процессе евразийской интеграции.

В тексте договора о создании Евразийского экономического союза сотрудничество средств массовой информации упоминается только в рамках положений о сотрудничестве наших трех государств в культурной сфере (приложение 29 к договору). В целом же определяющими для работы СМИ на едином экономическом пространстве являются положения соглашений о свободе инвестиций и торговле услугами. Суть их — в том, чтобы уравнять в правах компании, желающие осуществлять деятельность в сфере массовой информации, независимо от страны происхождения (в рамках Таможенного союза).

Но, конечно, процесс формирования единого информационного пространства евразийской интеграции к этому не сводится. В данном процессе первый вопрос — это диалог национальных СМИ и информационных пространств. Второй вопрос — это реализация совместных информационных проектов.

С точки зрения взаимодействия национальных информационных пространств, пожалуй, Беларусь



Фото Анатолия КЛЕЩУКА.

является самым динамичным участником Таможенного союза. У нас российские каналы не просто ретранслируются в кабельных сетях и принимаются со спутника, но входят в общедоступный обязательный пакет телевизионных программ, доводимый до всего населения страны за счет государства. Это, кстати, результат осознанной и последовательной позиции главы государства, который всегда выступал против самоизоляции Беларуси в информационном пространстве.

Казахстанские СМИ, к сожалению, пока не так хорошо представлены. Но мы готовы, как говорится, над этим вопросом поработать, если будет желание со стороны Астаны.

С точки зрения реализации совместных информационных проектов, как и во многих других моментах, у нас в рамках Союзного государства Беларуси и России наработан неплохой опыт создания и организации работы союзных средств массовой информации.

***(Продолжение на 2-й стр. «СЕ».)***

# Интеграция с общественной поддержкой

*(Окончание. Начало на 1 стр. «СЕ».)*

Это газеты «Союзное вече» и «Союз. Беларусь — Россия», телеканал «ТРО». Многие их критикуют. Но отрицать то, что эти медиа стали брендами со своей устойчивой аудиторией, вряд ли возможно. Кроме того, сама модель отношений, заложенная в основу их работы, думаю, является единственно приемлемой и в рамках более широкого формата сотрудничества.

Хочу отметить, что российские коллеги активно взялись за продвижение повестки евразийской интеграции в интернете. Появились многочисленные интернет-проекты. Думаю, такая работа необходима и Беларусь должна сама активно заявляться в этой среде. Надеюсь, что и ваше специальное приложение «Союз — Евразия» в скором времени станет не только выпускаться как «бумажное» издание, но и активней присутствовать в интернете.

**— Дарэчы, пра нядаўняе выступленне ў Маскве. Напярэдадні конкурсу паміж удзельнікамі адчуваецца канкурэнцыя, ці для вас гэта адна вялізная тусоўка?**

— Як я адчуў атмасферу, дух саперніцтва адсутнічае наогул — гэта не нацягнутыя ўсмешкі і дзяжурныя прывітанні, а сапраўды цікавыя знаёмствы і новыя стасункі. Спадзяюся, у Капенгагене якія-небудзь з гэтых знаёмстваў перарастуць у дружбу і далейшае супрацоўніцтва.

**— Ведаю, што многія артысты прымхлівыя. У цябе ці ёсць нейкі амулет на ўдачу?**

— Я спрабую пазбягаць усіх гэтых прымхаў і звязаных з імі трывог, але сапраўды ёсць талісман, які будзе са мной на конкурсе.

**— Наступны тыдзень ты ўжо сустрэнеш у Капенгагене. Хоць колькі слоў на дацкай вывучыў?**

— Думаю, давядзецца. Але пакуль што, шчыра прызнаюся, не вывучыў ні слова, так што нават не пытайце, як будзе па-дацку «добры вечар» ці «дзякуй"! Вярнуся — скажу.

**— Хто для цябе самы строгі крытык?**

— Гэта мае бацькі. Калі я патэлефанаваў пасля нацыянальнага фіналу, пацікавіўся ўражаннямі, сказалі: «Нешта з праходкай у цябе было не тое...» *(Смяецца.)* Насамрэч яны вельмі хвалююцца. Я столькі не перажываю, колькі перажывае мама, і як бы я яе ні ўгаворваў, яна ўсё адно не можа стрымаць эмоцыі, дый тата, хоць вонкава рэагуе больш спакойна, таксама за мяне хварэе. Вельмі хачу, каб іх перажыванні не былі дарэмнымі.

**— І мы ад усяго сэрца на тое ж спадзяёмся. Дай, Божа, каб было ўсё гожа!**

— Дзякуй. З Богам!

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і з асабістага архіва спевака.**

### Да ведама

**Юрый Вашчук, 31 год, па гараскопе Вадалей. Выпускнік эстраднага аддзялення Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, саліст Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Прадстаўнік Беларусі на міжнародным конкурсе песні «Еўрабачанне-2014». Выйдзе на сцэну ў другім паўфінале, 8 мая, пад нумарам 10, з песняй «Cheesecake». Акрамя яго, у нумары ўдзельнічаюць 3 бэк-вакалісты і 2 танцоры.**

**Сёлетні конкурс пройдзе ў Капенгагене з 6 па 10 мая пад лозунгам «Join Us» — «Далучайцеся». Удзел у ім бяруць прадстаўнікі 37 краін. Дарэчы, беларусы ўбачаць абодва паўфіналы і фінал конкурсу ў трансляцыі «Беларусь 1» і «Беларусь 24».**



Закрытое акционерное страховое общество
БЕЛНЕФТЕСТРАХ

Республика Беларусь,
220089, г. Минск,
3-я ул. Щорса, 9-11

УНП 101143603

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ЗАСО «Белнефтестрах» на 1 января 2014 г.

тыс. руб.

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2013 г. | На 31 декабря 2012 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 86 319 200 | 65 607 187 |
| Нематериальные активы | 120 | 164 906 | 175 047 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | 346 400 |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | 346 400 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 15 669 924 | 1 029 304 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 300 | 513 300 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 160 | 2 994 424 | 1 377 372 |
| Отложенные налоговые активы | 170 | 3 760 | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 362 413 | 284 761 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **105 514 927** | **69 333 371** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 4 675 568 | 4 470 439 |
| В том числе: материалы | 211 | 4 675 568 | 4 470 439 |
| незавершенное производство | 212 | - | - |
| прочие запасы | 213 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 215 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 220 | 314 403 | 540 126 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 230 | - | - |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 240 | 17 235 110 | 11 327 266 |
| В том числе: резерв незаработанной премии | 241 | 3 673 388 | 3 675 658 |
| резервы убытков | 242 | 13 561 722 | 7 651 608 |
| другие технические резервы | 243 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 90 078 276 | 12 258 962 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 187 870 805 | 138 768 198 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **300 174 162** | **167 364 991** |
| **БАЛАНС** | **300** | **405 689 089** | **236 698 362** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31 декабря 2013 г.** | **На 31 декабря 2012 г.** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 82 388 000 | 50 508 155 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 759 812 | 11 981 156 |
| в том числе резервный фонд заработной платы | 441 | 759 812 | 571 156 |
| Добавочный капитал | 450 | 13 358 987 | 16 863 075 |
| В том числе прирост (переоценка) стоимости объектов недвижимости, приобретенных за счет страховых резервов | 451 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 45 285 581 | 4 833 442 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **141 792 380** | **84 185 828** |
| **IV. СТРАХОВЫЕ РЕЗЕРВЫ И ФОНДЫ** | | | |
| Резервы по видам страхования, относящимся к страхованию жизни | 500 | - | - |
| Резерв незаработанной премии | 501 | 128 691 007 | 58 289 604 |
| Резервы убытков | 502 | 96 086 014 | 62 474 562 |
| Другие технические резервы | 503 | - | - |
| Иные страховые резервы | 504 | - | - |
| Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 505 | 5 567 083 | 4 131 845 |
| Гарантийные фонды | 506 | 38 218 | 26 649 |
| Иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 507 | 78 476 | 54 926 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **509** | **230 460 798** | **124 977 586** |
| **V. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | 1 236 208 |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 47 424 | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **590** | **47 424** | **1 236 208** |
| **VI. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 24 388 487 | 9 671 804 |
| В том числе: страхователям | 631 | 949 416 | 322 103 |
| страховым агентам и брокерам | 632 | 203 169 | 53 929 |
| прочим кредиторам по операциям страхования, сострахования | 633 | 2 181 416 | 51 722 |
| по операциям перестрахования | 634 | 3 152 491 | 3 746 944 |
| депо премий по рискам, переданным в перестрахование | 635 | - | - |
| поставщикам и подрядчикам | 636 | 5 074 340 | 497 429 |
| по авансам полученным | 637 | - | - |
| по налогам и сборам | 638 | 7 452 799 | 1 711 656 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 639 | 531 022 | 522 410 |
| по оплате труда | 640 | 3 242 378 | 2 408 205 |
| по лизинговым платежам | 641 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 642 | - | - |
| прочим кредиторам | 643 | 1 601 456 | 357 406 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 650 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 660 | 9 000 000 | 16 626 322 |
| Резервы предстоящих платежей | 670 | - | 614 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 680 | - | - |
| **ИТОГО по разделу VI** | **690** | **33 388 487** | **26 298 740** |
| **БАЛАНС** | **700** | **405 689 089** | **236 698 362** |

**Руководитель** **Ю.И.Несмашный**

**Главный бухгалтер** **Т.А.Лабыш**

**28 февраля 2014 года**

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗАСО «Белнефтестрах» за 2013 год

тыс. руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2013 г. | За январь–декабрь 2012 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ, ОТНОСЯЩЕМУСЯ К СТРАХОВАНИЮ ЖИЗНИ** | | | |
| Страховые взносы (страховые премии), брутто | 010 | - | - |
| Страховые выплаты | 020 | - | - |
| Изменение резервов по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или –) | 030 | - | - |
| Отчисления в гарантийный фонд и фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 040 | - | - |
| Расходы на ведение дела | 050 | - | - |
| Доходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни | 055 | - | - |
| Расходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни | 056 | - | - |
| Прибыль (убыток) от операций по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (строки 010 – 020 + 030 – 040 – 050 + 055 – 056) | 060 | - | - |
| **ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ ИНОМУ, ЧЕМ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ** | | | |
| Страховые взносы (страховые премии), брутто – всего | 070 | 384 276 923 | 237 980 437 |
| В том числе: по прямому страхованию и сострахованию | 071 | 368 732 958 | 232 902 209 |
| по рискам, принятым в перестрахование | 072 | 15 543 965 | 5 078 228 |
| Страховые премии по рискам, переданным в перестрахование, брутто | 073 | 16 718 589 | 15 005 630 |
| Страховые взносы (страховые премии) с учетом перестрахования, нетто (строки 070 – 073) | 074 | 367 558 334 | 222 974 807 |
| Изменение резерва незаработанной премии, брутто | 080 | (70 401 403) | (15 925 056) |
| Изменение доли перестраховщиков в резерве незаработанной премии | 081 | (2 270) | 137 997 |
| Изменение резерва незаработанной премии с учетом перестрахования, нетто (итог строк 080 и 081) | 082 | (70 403 673) | (15 787 059) |
| Заработанные премии, нетто (итог строк 074 и 082) | 085 | 297 154 661 | 207 187 748 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты), брутто | 090 | 142 975 974 | 105 128 929 |
| Доля перестраховщиков в убытках (страховых выплатах) | 091 | 3 836 089 | 3 128 732 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) с учетом перестрахования, нетто (строки 090 – 091) | 092 | 139 139 885 | 102 000 197 |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат), брутто | 095 | (33 611 452) | (18 502 692) |
| Изменение доли перестраховщиков в резервах убытков (страховых выплат) | 096 | 5 910 114 | 1 667 682 |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат) с учетом перестрахования, нетто (итог строк 095 и 096) | 097 | (27 701 338) | (16 835 010) |
| Заработанные премии за вычетом страховых убытков (страховых выплат) (строки 085 – 092 + 097) | 100 | 130 313 438 | 88 352 541 |
| Изменение других технических резервов | 110 | - | - |
| Изменение иных страховых резервов | 120 | - | - |
| Отчисления в фонды предупредительных мероприятий и гарантийные фонды | 130 | 12 150 303 | 8 295 323 |
| Отчисления в иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 140 | 849 182 | 1 022 577 |
| Расходы на ведение дела – всего | 150 | 102 660 200 | 72 278 500 |
| В том числе комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 151 | 1 243 656 | 724 725 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 155 | 624 486 | 1 119 494 |
| Доходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни | 160 | 20 624 810 | 6 977 051 |
| Расходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни | 165 | 885 937 | 112 691 |
| Прибыль (убыток) от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (строки 100 + 110 + 120 – 130 – 140 – 150 + 155 + 160) | 170 | 35 017 112 | 14 739 995 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 180 | 13 716 138 | 8 304 136 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 181 | 130 140 | 34 439 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 182 | 4 245 220 | 299 534 |
| проценты к получению | 183 | 9 340 778 | 7 921 329 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 184 | - | 48 834 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 190 | 592 208 | 44 699 |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 191 | 79 208 | 24 810 |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 192 | 513 000 | 19 889 |
| Доходы по финансовой деятельности | 200 | 29 329 305 | 15 147 741 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 201 | 28 270 148 | 15 147 741 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 202 | 1 059 157 | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 210 | 5 979 506 | 9 431 674 |
| В том числе: проценты к уплате | 211 | - | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 212 | 5 954 928 | 9 431 674 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 213 | 24 578 | - |
| Иные доходы | 220 | 69 577 891 | 43 801 993 |
| Иные расходы | 225 | 82 904 054 | 50 333 566 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (строки 180 – 190 + 200 – 210 + 220 - 225) | 230 | 23 147 566 | 7 443 931 |
| Прибыль (убыток) отчетного периода (строки ± 060 ± 170 ± 230) | 240 | 58 164 678 | 22 183 926 |
| Налог на прибыль | 250 | 12 188 874 | 5 123 077 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 260 | 3 760 | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 270 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 280 | - | 461 431 |
| Чистая прибыль (убыток) (строки ± 240 – 250 ± 260 ± 270 – 280) | 290 | 45 979 564 | 16 599 418 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 300 | 13 658 987 | 16 863 075 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 310 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (строки ± 290 ± 300 ± 310) | 320 | 59 338 551 | 33 462 493 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 330 | 9 599 | 3 463 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 340 | - | - |

**Руководитель** **Ю.И.Несмашный**

**Главный бухгалтер** **Т.А.Лабыш**

**28 февраля 2014 года**

KPMG

**ООО «КПМГ»**
ул. Димитрова, 5
Помещение 9
220004, Минск, Беларусь

Телефон +375 (17) 306 08 03
Факс +375 (17) 306 08 12
Моб. + 375 29 104 75 15
Интернет www.kpmg.by

**Аудиторское заключение по сокращенной бухгалтерской (финансовой) отчетности Закрытого акционерного страхового общества «Белнефтестрах» за 2013 год**

*Руководству Закрытого акционерного страхового общества «Белнефтестрах»*

Исх. номер 2204-01

Прилагаемая сокращенная бухгалтерская (финансовая) отчетность Закрытого акционерного страхового общества «Белнефтестрах» (далее – Предприятие), состоящая из бухгалтерского баланса на 31 декабря 2013 года, отчета о прибылях и убытках за год, закончившийся 31 декабря 2013 года, составлена на основании аудированной бухгалтерской отчетности Предприятия за 2013 год, подготовленной в соответствии с законодательством Республики Беларусь. В нашем аудиторском заключении от 28 февраля 2014 года мы выразили безусловно положительное аудиторское мнение по годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Предприятия.

Сокращенная годовая бухгалтерская (финансовая) отчетность не включает всех форм и раскрытий, требуемых законодательством Республики Беларусь. Таким образом, изучение сокращенной годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности не заменяет изучения годовой бухгалтерской отчетности Предприятия.

*Ответственность руководства относительно сокращенной бухгалтерской (финансовой) отчетности*

Руководство Предприятия несет ответственность за подготовку и объективное представление сокращенной бухгалтерской (финансовой) отчетности для целей публикации.

*Ответственность аудиторов*

В наши обязанности входит выражение мнения о данной сокращенной бухгалтерской (финансовой) отчетности, базируясь на результатах проведенных нами аудиторских процедур в соответствии с требованиями Республиканского правила аудиторской деятельности «Аудиторское заключение по специальному аудиторскому заданию», глава 6.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, сокращенная бухгалтерская (финансовая) отчетность, подготовленная на основе аудированной годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Закрытого акционерного страхового общества «Белнефтестрах» на 31 декабря 2013 года, соответствует во всех существенных отношениях годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности, на основе которой она была подготовлена для целей публикации баланса и отчета о прибылях и убытках.

**Вольскис Эдгарс**
Заместитель директора по общему аудиту

**Андриевская Ольга Михайловна**
Аудитор

22 апреля 2014
г. Минск, Республика Беларусь
ООО «КПМГ»

Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским горисполкомом на основании решения от 10.02.2011, УНП 191434140

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1.** Автомобиль УАЗ-31514-8-053, 2010 г.в., гос. № 3689ВТ2, первоначальная стоимость 37 337 000 белорусских рублей.<br>**Лот № 2**. Трактор МТЗ-1221, 2000 г.в., первоначальная стоимость 31 533 000 белорусских рублей.<br>**Лот № 3.** Трактор МТЗ-1221, 2000 г.в., первоначальная стоимость 31 533 000 белорусских рублей.<br>**Лот № 4.** Цепь навозоудаления, первоначальная стоимость 2 109 000 белорусских рублей.<br>**Лот № 5.** Цепь навозоудаления, первоначальная стоимость 2 109 000 белорусских рублей.<br>**Лот № 6.** Полуприцеп ПСТ-6, первоначальная стоимость 17 213 000 белорусских рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | КФХ «Дубрава» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебский район, д. Присушино, ферма КФХ «Красника», хоздвор ОАО «Белагропромбанк», г. Витебск, ул. Димитрова, 31, мехмастерская, ОАО «Агротруд», Витебский район, пос. Яновичи |
| **Информация об обременениях** | Арест хозяйственным судом Витебской области (залог ОАО «Белагропромбанк») |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 323 21 мая 2014 года в 10.00 |
| **Справочная информация** | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, г. Витебск, ул. Правды, д. 34.<br>Заместитель начальника отдела Коржов Алексей Игоревич, тел./факс (80212) 60 09 09, начальник отдела — Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) не позднее 20.05.2014 на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, МФО 635, УНП 300002505. Минимальная величина первого шага — 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

**Отчет Местного благотворительного Фонда детей-инвалидов с художественными способностями «Голубые берега» г. Могилева об использовании своего имущества за 2013 год**

Фонд «Голубые берега» информирует о продолжении своей деятельности, согласно своего Устава, по адресу: г. Могилев, ул. Сурганова, д. 21, а также сообщает о том, что по состоянию на 1 января 2013 года баланс Фонда составил — 50 млн руб.

В том числе: благотворительные взносы частных лиц составили — 2,5 млн руб.;

- спонсорская помощь частных юридических лиц — 50 млн. руб.;
- гуманитарная помощь — 7 443 340 евро;
- общая сумма расходов, понесенных Фондом на реализацию Уставной деятельности, — 11 943 340 руб.;
- укрепление материально-технической базы — 15,8 млн руб.;
- общая сумма расходов, использованных на погашение арендных платежей, — 40,5 млн руб.

Стоимость имущества составляет — 13 350 000 тыс. руб. и используется для работы детских кружков и клубов.

Количество учредителей Фонда — 3.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

УНП 790175626

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1. Полуприцеп самосвальный тракторный ПСТ-9, гос. № ВВ-2-1050, первоначальная стоимость 23 347 800 белорусских рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | КФХ «Дубрава» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. Димитрова, 31, хоздвор ОАО «Белагропромбанк» |
| **Информация об обременениях** | Арест хозяйственным судом Витебской области (залог ОАО «Белагропромбанк») |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 323 22 мая 2014 года в 10.00 |
| **Справочная информация** | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, г. Витебск, ул. Правды, д. 34.<br>Заместитель начальника отдела Коржов Алексей Игоревич, тел./факс (80212) 60 09 09, начальник отдела — Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) не позднее 21.05.2014 на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, МФО 635, УНП 300002505. Минимальная величина первого шага — 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

■ Факт

# АЎТАМАБІЛІ ДЛЯ СВЯТА ХАКЕЯ

Генеральны спонсар чэмпіянату свету па хакеі, кампанія Skoda, передала дырэкцыі хакейнага першынства ў Мінску 46 аўтамабіляў

**Кампанія ўжо на працягу 22 гадоў з'яўляецца галоўным спонсарам планетарнага першынства. Гэта самае доўгае генеральнае спонсарства ў гісторыі міжнародных спартыўных спаборніцтваў.**

Кожны год арганізатарам чэмпіянату прадастаўляецца ад 40 да 50 аўтамабіляў. На працягу 22 гадоў сумарны прабег гэтых машын склаў каля 5,5 млн км падчас іх афіцыйнага выкарыстання на чэмпіянатах.

Як адзначыў **намеснік дырэктара «Дырэкцыі па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі з шайбай» Аляксандр ШЭВЕЛЬ**, перададзеныя аўтамабілі будуць выкарыстоўвацца для перамяшчэння афіцыйных асоб і ганаровых гасцей чэмпіянату. Таксама імі могуць скарыстацца ўсе прадстаўнікі Міжнароднай федэрацыі хакея, пачынаючы ад прэзідэнта Рэнэ Фазеля і заканчваючы звычайным супрацоўнікам і ўдзельнікам спаборніцтваў. Аўтамабілі таксама будуць у «Мінск-Арэне» і «Чыжоўка-Арэне», адна машына будзе знаходзіцца ў аэрапорце Мінска.

Плануецца, што пасля завяршэння чэмпіянату ўсе машыны будуць рэалізаваныя. Зніжка на іх складзе не менш за 20%.

Аляксандр Шэвель распавёў пра тое, як праходзіць завяршальная стадыя падрыхтоўкі чэмпіянату свету:

— Цяпер пачынаецца самая гарачая пара для арганізацыйнага камітэта чэмпіянату. З учарашняга дня ўступіў у сілу ўказ аб бязвізавым уездзе ў Беларусь гасцей і ўдзельнікаў спаборніцтваў. Ужо гатовы ўсе дагаворы па абслугоўванні і харчаванні спартсменаў. Каманды-ўдзельніцы прыбудуць у Мінск 6–7 мая.

Намеснік дырэктара таксама адзначыў, што завяршаецца і рэалізацыя білетнай праграмы на чэмпіянат, распрададзена каля 80% усіх квіткоў. Праблем з наведвальнасцю матчаў не чакаецца. Паводле яго слоў, на чэмпіянат свету ў Мінску ўжо акрэдытавана 260 журналістаў і 130 фотакарэспандэнтаў, такім чынам, агульная квота Міжнароднай федэрацыі хакея ў 400 акрэдытаваных прадстаўнікоў СМІ ўжо практычна запоўнена. Зараз завяршаюцца работы па стварэнні інфраструктуры на хакейных арэнах і ў фан-зонах. Што тычыцца цырымоніі адкрыцця чэмпіянату, Аляксандр Шэвель не змог раскрыць усіх сакрэтаў, сказаўшы толькі, што прадстаўленне, згодна з міжнародным рэгламентам, зойме 15 хвілін і адбудзецца 9 мая перад матчам Беларусь — ЗША.

— Чэмпіянат свету па хакеі — гэта вельмі важная для ўсіх нас і вас падзея. Спаборніцтвы будуць транслявацца ў 120 краінах па 300-х тэлевізійных станцыях. Упершыню з 2006 года сусветнае першынство па хакеі праходзіць у адным горадзе, і я вельмі ўражаны Мінскам. У вас фантастычная інфраструктура і выдатныя арэны, гэта лепшая камбінацыя, якую я бачыў за апошнія 10 гадоў. Горад гатовы для правядзення чэмпіянату,— адзначыў **Крыстоф МАЎЭР, дырэктар па зімовых відах спорту кампаніі «Інфронт», камерцыйнага партнёра чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску.**

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## ПАКАШТУЙЦЕ

### Курыная пастрама

***Спатрэбіцца:*** *курыная грудка — 400 г; вадкі мёд — 2 чайныя лыжкі; малако — 250 мл; соевы соус — 1 ч. лыжка; салодкая молатая папрыка — 2 ч. лыжкі; вострая папрыка — 0,5 ч. лыжкі; куркума — 0,25 ч. лыжкі; соль — 1 ч. лыжка; молаты мускатны арэх — 0,25 ч. лыжкі; молатая зіра — 0,2 ч. лыжкі; аліўкавы алей — 2 сталовыя лыжкі; часнок — 2 зубкі.*

Курыную грудку трэба добра прамыць пад праточнай вадой і пакласці ў міску. Заліць малаком з разведзеной у ім солллю. Верх міскі абгарніце харчовай плёнкай і прыміце міску на ноч у халадзільнік.

Змяшайце вострую і салодкую папрыку, куркуму, молаты мускатны арэх, зіру. Да спецый дадайце соевы соус, вадкі мёд, аліўкавы алей і здробнены часнок. Змяшайце. Атрыманай сумессю добра з усіх бакоў абмажце курынае мяса і пакіньце на 30 хвілін прамарынавацца. У разагрэтую духоўку (220 °С) пакладзіце грудку і запякайце хвілін 25–30. Час выпякання залежыць ад памеру грудкі. Калі запякаць занадта доўга, пастрама можа атрымацца сухой. Гатовую астылую пастраму наразаюць і падаюць да стала.

### Вяленая ялавічына

***Спатрэбіцца:*** *ялавічная выразка (невялікая, 3–5 см у дыяметры), буйная марская соль і свежамолатых чорны перац; сухія (!) спецыі на выбар: кмен, кумін, каляндра, шалфей, размарын, сушаны часнок, папрыка, чабор.*



Чысцім мяса ад усяго лішняга. У прыдатны латок насыпаем на дно пласт солі з чорным молатым перцам. Кладзем мяса, зверху зноў прысыпаем солllю. Дробная соль не падыходзіць для засолкі мяса, бо яна ўбіраецца занадта хутка і ў большай, чым трэба, колькасці. Замест марской можна ўзяць звычайную каменную. Накрываем латок з мясам плёнкай і выносім на холад (ці ў халадзільнік) на 12 гадзін. Дастаем прасоленае мяса, счышчаем соль. Абсушваем папяровым ручніком. Змешваем выбраныя спецыі і націраем імі мяса. Загортваем выразку ў чыстую сухую марлю (або тонкі кухонны ручнік). Змяшчаем у прахалоднае месца з добрай вентыляцыяй. Можна таксама пакласці мяса ў халадзільнік, не забываючы яго пераварочваць двойчы на дзень. Праз тыдзень мяса гатова. Вядома, гэта не азначае, што яго неабходна спажыць адразу і ў поўным аб'ёме. Вяленае мяса можа захоўвацца вельмі доўга, галоўнае — захоўваць тэмпературны рэжым, не даваць яму папсавацца ад вільгаці.

## ЗАКОНЫ СТЫЛЮ

### Гардэроб для «грушы»

**Для кожнага тыпу фігуры існуюць пэўныя правілы падбору адзення, якія дапамогуць схаваць заганы і падкрэсліць вартасці таго ці іншага целаскладу. Галоўнае правіла для ўладальніц фігуры тыпу «груша» — перасоўванне акцэнту на верхнюю частку цела. Гэта неабходна для таго, каб вонкава ўраўнаважыць аб'ёмныя клубы і малыя плечы. Асаблівым гонарам жанчын з такой фігурай лічыцца талія, якая таксама патрабуе ўвагі. Яе неабходна падкрэсліваць папругамі або паясамі.**



**Сукенкі** трэба выбіраць такога крою, каб трохі прыставалі да фігуры, а таксама фасону трапецыя, з падплечнікамі, з рукавамі «кажан» або «ліхтарык», на шырокіх шлейках. Дарэчны будзе багаты дэкор і буйныя прынты ў вобласці грудзей. Выраз гарлавіны на сукенцы вітаецца V-падобны або квадратны. У камбінаваных мадэлях з двух колераў цёмныя адценні павінны быць знізу, а светлыя — зверху. Варта адмовіцца ад сукенак-футаралаў, а таксама прамалінейных фасонаў, пазбягаць тонкіх шлеек і паўкруглых выразаў.

**Штаны** вітаюцца шырокія і прамыя, а вось завужаныя мадэлі насіць не варта, яны абцяжарваюць фігуру, робяць яе непрапарцыянальнай. Не варта набываць штаны з накладнымі кішэнямі, буйнымі прынтамі і ўзорамі на сцёгнах. Мэтазгодней аддаць перавагу аднатонным мадэлям з праразнымі кішэнямі.

**Спадніцы** пажаданыя з лёгкіх матэрыялаў або з тонкага трыкатажу. Гэта могуць быць прамыя або трапецападобныя фасоны. Мехаватыя мадэлі, спадніцы фасонаў «цюльпан», «сонца» або «паўсонца» катэгарычна супрацьпаказаны. Вырабы з завышанай таліяй таксама не прымальныя.

На фігурах тыпу «груша» даволі гарманічна глядзяцца **топы, блузы і пуловеры** з глыбокім дэкальтэ або прастакутным выразам. Прыцягнуць увагу да верхняй часткі тулава можна з дапамогай гальштукаў, буйных брошак, пацерак і ланцужкоў, якія не толькі дапоўняць вобраз, але і нададуць яму адметнасць.

Занадта свабодныя **кашулі і футболкі**, як і заліш не ў абліпку не пасуюць. Жакеты і кардыганы павінны быць прыталеныя, даўжынёй да таліі або да сярэдзіны сцягна.

Пры выбары **купальніка** варта аддаць перавагу неразразным аднатонным мадэлям з шырокімі шлейкамі або без іх. Таксама падыдуць суцэльныя купальнікі з падзелам на два каляровыя блокі: ніжні — цёмных адценняў, верхні — яркіх або з буйным малюнкам.

Фігура тыпу «груша»: вузкія плечы, невялікія грудзі, тонкая талія, шырокія клубы і поўныя ногі.

■ Навіны сталіцы

## Пункт прыёму для... батарэек

У Мінску плануецца стварыць вытворчасць па перапрацоўцы батарэек



Такі праект заказаны Нацыянальнай акадэміяй навук. Ужо вывучаны тэхналогіі, якія прымяняюцца ў свеце, і выбраны тыя, якія можна адаптаваць у Беларусі. Але каб увесці ў эксплуатацыю новае прадпрыемства, аб'ём утварэння адходаў батарэек павінен складаць не менш як 100 т за год. Да такіх лічбаў краіна пакуль не дарасла. Каб стымуляваць жыхароў сталіцы і іншых гарадоў збіраць старыя батарэйкі, ва Указ «Аб некаторых пытаннях абыходжання з адходамі спажывання» ўнясуць змены. Пры здачы адпрацаваных элементаў сілкавання ў крамы людзі будуць атрымліваць зніжку на набыццё новых тавараў. Плануецца таксама адкрыць новыя прыёмныя пункты і павышаць закупачныя цэны на другасную сыравіну.

**Любоў ЯГОРАНКАВА, «Мінск-Навіны»**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні вы, нарэшце, зможаце значна прасунуцца наперад, трэба толькі выбраць правільны кірунак. Давядзецца ўзяць свой тэмперамент пад асаблівы кантроль, інакш ён сыграе з вамі злы жарт. У працы будзе вельмі ярка выяўлены дух саперніцтва. Ваша бурная дзейнасць акажацца вельмі паспяховай, аднак пазбягайце празмерных перагрузак, яны здольны падарваць здароўе.

**ЦЯЛЕЦ.** Прысвяціце панядзелак актыўнай працы, а вынік будзе роўны выдаткаваным намаганням. У аўторак можаце нечакана лёгка дасягнуць сваіх мэтаў, калі дакладна паставіце іх перад сабой, і паспрабуйце ў гэты дзень не заставацца ў адзіноце. Сур'ёзнасць і гатоўнасць пайсці на апраўданую рызыку абавязкова прыцягне да вас увагу начальства і выкліча яго павагу. Не спяшайцеся навязваць сваю волю блізкім людзям, атрымаеце значна лепшы вынік.

**БЛІЗНЯТЫ.** Мае сэнс павучыцца самадысцыпліне, бо вам лёгка ўдаецца аказваць уплыў, але ён не заўсёды той, які варта аказваць. Пажадана прааналізаваць, ці ўсё вы правільна робіце і ці да тых мэтаў імкнецеся. У чацвер ні ў якім выпадку не згаджайцеся на авантурныя прапановы. Суботу можна прысвяціць справам, звязаным з будаўніцтвам або рамонтам дома, а нядзеля — не самы прыдатны час для заняткаў незнаёмай дзейнасцю.

**РАК.** Акалічнасці могуць запатрабаваць свежасці ў думках і засяроджанасці на ўчынках. Цяпер самае галоўнае — не пераацаніць свае магчымасці, бо пазіцыі партнёраў могуць нечакана аказацца мацнейшымі. Чацвер — адзін з самых спрыяльных дзён тыдня, таму без шкадавання гаіце ляноту прэч ад сябе, і тады не выпусціце птушку ўдачы.

**ЛЕЎ.** Паспрабуйце быць паслядоўным у дзеяннях. У пачатку тыдня вы павінны быць адкрыты для новых прапаноў, хутчэй за ўсё, яны пачнуць паступаць да вас у нарастальным тэмпе. Уся даступная ў гэтыя дні інфармацыя акажацца карыснай і вельмі патрэбнай. А вось у пятніцу не падпісвайце ніякіх папер без крайняй на тое неабходнасці, у адваротным выпадку старанна правярайце ў літаральным сэнсе кожную літару і лічбу.

**ДЗЕВА.** У пачатку тыдня новыя ідэі і жаданне будаваць планы на іх аснове будуць наведваць асабліва часта. Пры гэтым не выключана, што давядзецца выбіраць паміж прывабнай і вельмі прывабнай прапановай, але не забывайце, што ад добрага лепшага не шукаюць. У сярэдзіне тыдня безуважлівасць можа саслужыць дрэнную службу, будзьце вельмі ўважлівыя, асабліва працуючы з новымі дакументамі.

**ШАЛІ.** Нарэшце вы зрушыцеся з мёртвага пункта, завяршаючы хаджэнне па коле. Цяпер у вас павінны з'явіцца новыя цікавыя арыгінальныя ідэі, увасабляйце іх у жыццё, пакуль час працуе на вас. Дастаткова добрыя дні для замежных паездак, таксама магчымыя частыя і кароткія мясцовыя перамяшчэнні, у якіх не выключаны праблемы з транспартам. Пажадана праводзіць больш часу дома з сям'ёй: прыдумайце, як разнастаіць вольны час.

**СКАРПІЁН.** На пачатку тыдня вельмі верагодныя цяжкасці ў стасунках з суседзямі і сваякамі. Паведамляць ім пра свае жыццёвыя пазіцыі бескарысна, яны вас усё роўна не пачуюць. Калі раптам пачуццё няўпэўненасці пачне перашкаджаць засяроджвацца, то паверце, у вас значна больш сіл і ведаў, чым вы думаеце. У пятніцу грашовыя пытанні могуць раптам апынуцца ў цэнтры ўвагі: паспрабуйце дакапацца да самай сутнасці праблемы, каб яна не ствярала непрыемных сітуацый.

**СТРАЛЕЦ.** Магчыма вас запросяць удзельнічаць у шматабяцальным праекце, таму паспрабуйце доўга не разгойдвацца, інакш лёгка страціце добразычлівасць поспеху. Першыя крокі пажадана распачаць ужо ў панядзелак. У аўторак і сераду сур'ёзных мерапрыемстваў лепш не планаваць, затое ў другой палове тыдня практычна ўсё задуманае будзе атрымлівацца з лёгкасцю. Субота можа натхніць на гаспадарчыя справы, а вось нядзеля будзе схіляць да адзіноты.

**КАЗЯРОГ.** Можа з'явіцца жаданне навесці ў працы парадак і прыгажосць. Назапашаныя веды і вопыт будуць спрыяць умацаванню аўтарытэту, аднак не варта залішне бравіраваць імі перад калегамі. Не спяшайцеся брацца за справу, калі не адчуваеце сябе ў гэтай галіне моцным прафесіяналам. Вам можа часова адмовіць ваша звычайная праніклівасць, таму не спяшайцеся цешыць сябе ілюзіямі і адмоўцеся ад прыняцця сур'ёзных рашэнняў.

**ВАДАЛЕЙ.** Паспяховасць дзеянняў цяпер наўпрост залежыць ад іх дакладнасці і паслядоўнасці. Жыццерадаснасць і аптымізм будуць прываблівать людзей і спрыяць росту вашай папулярнасці. У пятніцу ці суботу не ўпусціце падораны лёсам шанц, яго варта выкарыстаць, каб умацаваць свае пазіцыі не толькі ў матэрыяльным, але і ў духоўным плане. Прыслухоўвайцеся да голасу інтуіцыі, яна падкажа правільнае рашэнне.

**РЫБЫ.** З лёгкасцю справўляцца ная з самымі складанымі задачамі дапаможа пазітыўны погляд на свет. У аўторак дазвольце сабе адпачыць ад мітусні і клопатаў, адчуйце смак да жыцця. Сустрэчу з кіраўніцтвам паспрабуйце выкарыстаць у сваіх мэтах, данясіце свае ідэі, вашу ініцыятыву абавязкова падтрымаюць. У нядзелю вас можа наведаць цікавая ідэя па пераўладкаванні дома.

# «ЧАРНОБЫЛЕМ НЕ ЗАРАСЦЕШ»




**Па гарызанталі:** **1.** «Чорны ... ». Фільм рэжысёра В. Турава аб жыцці ў чарнобыльскай вёсцы. **4.** «Мама, мама,\\Там, у Зоне,\\Засталася ...Галя».\\— «Спаць, дачушка». З верша А. Камароўскага «Чарнобыльская калыханка». **6.** Малакроўе. **10.** Усходняя, узвышаная частка хрысціянскага храма. **11.** Абрад пахавання нябожчыка. **12.** Тое, што і вянок. **15.** «І едуць зноў перасяленцы\\Дамоў, ды толькі на ...». З верша «Апошняе перасяленне» М. Лешчуна. **17.** Вялікі прамежак часу. **19.** Адзінка вымярэння аб'ёму друкаванага тэксту. **20.** Адмоўны электрод. **21.** «Зорка ...». Араторыя Д. Даўгалёва. **22.** Адказнасць. **24.** «Што ў вясняным чыстазвоне кропель -\\ёд ці стронцый? ... ці палоній?». З верша «Вясна трывогі нашай» А. Вялюгіна. **26.** «За ракою — пыхкае АЭС.\\Без людзей — пагорбіліся хаты.\\Вось дзе ён канчаецца, прагрэс:\\У руках з рыдлёўкамі — ...». З верша «Радыяцыя — нябачны акупант» А. Грачанікава. **30.** Вадкасць, насычаная варам таго, што ў ёй варылася. **32.** «Чарнобыльская ... ». Верш М. Скобы. **33.** Металічная рамка для патронаў. **34.** Рухавік.

**Па вертыкалі:** **1.** Месца для захоўвання тавараў, матэрыялаў. **2.** «Бліскавіцай урану можна ... спапяліць».З верша «Той чарнобыльскай ноччу» Г. Бураўкіна. **3.** Паўднёвае вечназялёнае дрэва. **5.** Паглыбленне ў зямлі. **7.** «Хай свеціцца ... тваё, Беларусь,\\У стронцыі, цэзіі, ліціі!». З верша «Малітва наступнасці» Р. Барадуліна. **8.** Колькасць будынкаў аднолькавага прызначэння. **9.** «Я ўзіраюся ў зорнае ...\\Над мёртвымі вёскамі\\Гомельшчыны і Магілёўшчыны». З верша «Пілоту» А. Канапелькі. **13.** «У ветры дзікім не загінеш,\\чарнобылем не зарасцеш». З верша «О Беларусь, мая ... ». У. Дубоўкі. **14.** «Ды ўжо ашчэрыўся ...,\\Вось — вось атрута упадзе». З верша М. Мятліцкага «Год». **16.** Аддзяленне ад таго, што колецца. **18.** Спецыяліст па оптыцы. **21.** Механізм для апрацоўкі чаго-небудзь ціскам. **23.** «... бяды над родным краем.\\Тое, што пасеялі, збіраем». З верша М. Маляўкі «Тое, што пасеялі, збіраем». **25.** Рака, левы прыток Прыпяці. **27.** «Ты праз ... смяротна калючы\\Не вярнуўся ка мне ўпершыню». З верша «Жонкам пажарнікаў, загінуўшым на Чарнобыльскай АЭС» З. Гасціловіч. **28.** Калючы ...Тое, чым абнесена чарнобыльская зона. **29.** «Са стронцыем сёння паснедаў,\\З плутоніем, мусіць, абедаў\\І з цэзіем вымыў свой ...». З верша «Як многа чарнобыльскі ўдар…» Я. Мальца. **31.** «... Айчыны — чарнобыльскі ...». Верш Э. Акуліна.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ**, *г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Бусел. 4. Лялька. 6. Анемія. 10. Алтар. 11. Хаўтуры. 12. Вянец. 15. Клады. 17. Эпоха. 19. Аркуш. 20. Катод. 21. Палын. 22. Адказ. 24. Цэзій. 26. Салдаты. 30. Адвар. 32. Талака. 33. Абойма. 34. Матор.

**Па вертыкалі:** 1. База. 2. Свет. 3. Лаўр. 5. Яма. 7. Імя. 8. Блок. 9. Неба. 13. Шыпшына. 14. Рэактар. 16. Адкол. 18. Оптык. 21. Прэс. 23. Знак. 25. Іпа. 27. Атам. 28. Дрот. 29. Твар. 31. Дым.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.45 | 20.31 | 14.46 |
| Віцебск — | 5.30 | 20.25 | 14.55 |
| Магілёў — | 5.35 | 20.21 | 14.46 |
| Гомель — | 5.36 | 20.13 | 14.37 |
| Гродна — | 6.00 | 20.46 | 14.46 |
| Брэст — | 6.05 | 20.42 | 14.37 |

**Месяц**

*Маладзік 29 красавіка. Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

*Пр. Арцёма, Дзмітрыя. К. Клаўдзіі, Марыі, Васіля, Рышарда.*



Фота Софі КУСЯНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




■ Гарадская гаспадарка

## СТАЛІЦА НА «ВОДНАЙ ДЫЕЦЕ»

**У маі ў Мінску пачынаюцца планавыя адключэнні гарачай вады, звязаныя з падрыхтоўкай цеплавых сетак горада да працы ў зімовых умовах.**

Па інфармацыі прэс-службы Мінгарвыканкама, пачатак «часовых нязручнасцяў» прызначаны на 26 мая. Поўны спіс вуліц і дамоў, у якіх чакаецца адключэнне, можна знайсці на сайце Мінгарвыканкама www. minsk.gov.by ў раздзеле «Гэта актуальна». Дадатковую інфармацыю можна атрымаць у жыллёва-эксплуатацыйных упраўленнях. У выпадку паспяховага выпрабавання трубаправодных цеплавых сетак гарачая вада будзе адсутнічаць не больш за 14 сутак.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

**НАРОДЖАНЫЯ 26 красавіка**

**Гэта дзень працаўніка, надзеленага талентам не толькі ўтвараць новыя сістэмы і структуры, але і рабіць усё, каб захаваць, зберагчы ад непрыемнасцяў калектыў, сваё асабістае жыццё, здароўе і дабрабыт як сваіх блізкіх, так і сяброў. Яны ўпартыя, негаваркія, але адкрытыя для самаўдасканалення. Ім хапае пачуцця гумару, каб адкрыта пасміхацца са свайго занудства. Яны могуць сутыкнуцца з праблемай адзіноты, таму што залішне патрабавальныя да сваіх блізкіх, перакананыя, што ўсё вакол павінна быць зроблена па ідэальных узорах. Людзі гэтага дня па-асабліваму ставяцца да выканання і павагі закону і правапарадку.**

**НАРОДЖАНЫЯ 27 красавіка**

**Гэтыя людзі рэдка становяцца лідарамі. Найбольшае задавальненне яны знаходзяць у магчымасці адасобіцца і дзейнічаць у абставінах поўнага спакою. Яны валодаюць магутным інтэлектуальным зарадам, заўсёды шукаюць карысці ад свайго дзеяння, валодаюць рэдкай здольнасцю пераносіць няўдачы і няшчасці. У асабістых адносінах паводзяць сябе з годнасцю, шануюць хатнюю ўтульнасць і сямейную пяшчоту. Гэтыя людзі аказваюцца вельмі кампетэнтнымі спецыялістамі, дасведчаныя пра ўласныя магчымасці і рэдка пераацэньваюць сябе. Ім неабходна шукаць такіх сяброў, якія б змаглі захапіць іх вясёлосцю і аптымізмам, таму што ім неабходны смех і бесклапотнасць.**

Даты | Падзеі | Людзі

***Дзень памяці загінулых у радыяцыйных аварыях і катастрофах***

**1660** год — нарадзіўся Даніель Дэфо, англійскі пісьменнік і публіцыст. Велізарны жыццёвы вопыт стаў асновай яго творчасці. Творы Даніеля Дэфо былі разлічаны не на тонкі густ знаўцаў, людзей вучоных і дасведчаных, а на здаровы сэнс простага чалавека. Да пісьменніцкай працы Дэфо звярнуўся позна. Нягледзячы на гэта, яго літаратурная спадчына немалая. Разам з публіцыстыкай яна налічвае больш за 250 твораў. Цяпер многія кнігі пісьменніка вядомыя толькі вузкаму колу спецыялістаў. Выключэнне складае хіба «Рабінзон Круза», які да гэтага часу чытаюць як у вялікіх еўрапейскіх краінах, так і ў аддаленых кутках зямнога шара. Сваёй творчасцю Дэфо змог узвысіць значэнне рамана, ператвараўшы яго з кнігі для забавы ў крыніцу важных ідэй, рухавік духоўнага развіцця.

**1899** год — 115 гадоў таму нарадзіўся (вёска Замосце, цяпер Уздзенскі раён) Ільля Гурскі, пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1932-м скончыў БДУ. У 1935-41 гадах — рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва», у Вялікую Айчынную вайну — газеты «За Свабодную Беларусь» і сатырычнага лісткa «Партызанская дубінка», у пасляваенны час рэдагаваў часопіс «Беларусь». Аўтар раманаў «У агні», «Вецер стагоддзя», «Чужы хлеб», п'ес «Новай дарогай», «Дрыгва» і іншых твораў. На беларускую мову перакладаў творы М. Горкага, А. Чэхава, М. Твена. Памёр у 1972 годзе.



**1929** год — 85 гадоў таму нарадзіўся (вёска Гарадзец Рагачоўскага раёна) Мікалай Мікітавіч Слюнькоў, дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы (1974 ), заслужаны работнік прамысловасці Беларусі (1972). З 1950 года працаваў на МТЗ, з 1960-га — дырэктар Мінскага завода запасных частак. З 1972 года — першы сакратар Мінскага гаркама КПБ, у 1974—1983-м — намеснік старшыні Дзяржплана СССР, з 1983 года — першы сакратар ЦК КПБ, з 1987-га — сакратар ЦК КПСС, загадчыкам эканамічнага аддзела ЦК КПСС, у 1988-91 гадах — старшыня Камісіі ЦК КПСС па пытаннях сацыяльна-эканамічнай палітыкі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

## УСМІХНЕМСЯ

На працягу двух тыдняў, якія прайшлі на курорце, я атрымала ад мужа толькі адну SMS-ку: «Дзе штопар?».

**90% квіткоў на канцэрты Стаса Міхайлава купляюцца за аліменты.**

Кавярня — гэта мастацтва садраць з кліента за кубачак кавы кошт двухсотграмовай бляшанкі з кавай.

**Выносіў смецце. Суседзі падумалі, што пераязджаю.**

— Алё, гэта булачная?! Да вас абаранкі паступілі?
— Так, паступілі.
— Вось бачыш, сынок, нават абаранкі паступілі!..

**Кожная бабуля лічыць, што самыя галодныя людзі ў свеце — гэта яе ўнукі.**




caricatura.ru

Дарагія грамадзяне! Я вас усіх вельмі люблю, і ўсё, што вы мне зычыце, я жадаю вам у падвойным памеры.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 21.617. Індэкс 63850. Зак. № 1630.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 25 красавіка 2014 года.